№ 94 (1907)
Чацвер, 27 мая 2004 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах
Перыядычнасць — 5 разоў у тыдзень
Выдавец: УП «Народная воля»
Кошт свабодны.

Народная Воля

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...
Якуб КОЛАС

E-mail: nv@promedia.by
http://nv.promedia.by

Надвор'е

У Мінску сёння ўдзень чакаецца — +13...+15, уначы — +5...+7, на працягу сутак — без ападкаў; у Брэсце ўдзень — +16...+18, сонечна, уначы — +6...+8, без ападкаў; у Гродне ўдзень — +13...+15, уначы — +5...+7, на працягу сутак — без ападкаў; у Віцебску ўдзень — +13...+15, уначы — +6...+8, на працягу сутак — без ападкаў; у Гомелі ўдзень — +11...+13, уначы — +8...+10, на працягу сутак — дождж; у Магілёве ўдзень — +14...+16, сонечна, уначы — +6...+8, на працягу сутак — без ападкаў.

www.meteo.by

Пейджинговую связь редакции обеспечивает
МОБИЛКОМ
пейджинг-система
(017) 222-46-51
(017) 222-46-52

З прызначэннем!

ІВАН БАМБІЗА **прызначаны** намеснікам прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь (раней ён узначальваў канцэрн "Белнафтахім").

Міністрам сельскай гаспадаркі і харчавання прызначаны **Леанід Русак** (у 2003 годзе — старшыня Мінскага райвыканкама). У сваю чаргу, ***ВАСІЛЬ ДВАРАНІНОВІЧ*** вызвалены ад пасады міністра сельскай гаспадаркі і харчавання "ў сувязі з выхадам у адстаўку".

ГАННА ДЗЕЙКА прызначана міністрам па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь (раней — намеснік міністра па падатках і зборах);

РАМАН УНУЧКА — членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь (раней — віцэ-прэм'ер урада Беларусі);

МІХАІЛ САВІЧ — намеснікам старшыні Дзяржаўнага ваенна-прамысловага камітэта Рэспублікі Беларусь (раней — начальнік штаба войск СПА Беларусі).

Дадзена згода прэзідэнта на прызначэнне:

БРАНІСЛАВА СІВАГА — старшынёй Беларускага дзяржаўнага канцэрна па нафце і хіміі "Белнафтахім" (раней — гендырэктар ААТ "Шкловалакно");

ІНЫ МЯДЗВЕДЗЕВАЙ — намеснікам міністра статыстыкі і аналізу Рэспублікі Беларусь (раней узначальвала галоўнае ўпраўленне статыстыкі прадпрыемстваў і паліўна-энергетычнага комплексу Мінстата);

МІХАІЛА РЫМЖЫ — намеснікам міністра аховы здароўя — галоўным дзяржаўным санітарным урачом Рэспублікі Беларусь (раней — галоўны спецыяліст па эпідэміялогіі і прафілактыцы ўнутрыбальнічных інфекцый Міністэрства аховы здароўя);

МІХАІЛА ЮХІМУКА — намеснікам старшыні Брэсцкага аблвыканкама;

МІКАЛАЯ ТОКАРА — старшынёй Жабінкаўскага райвыканкама (Брэсцкая вобласць);

ВІКТАРА ВІЛЬЧЫКА — старшынёй Дзятлаўскага райвыканкама (Гродзенская вобласць);

МЕЧЫСЛАВА ГОЯ — старшынёй Смаргонскага райвыканкама (Гродзенская вобласць);

АЛЯКСАНДРА ІЛЬЯНАВА — старшынёй Бялыніцкага райвыканкама (Магілёўская вобласць);

УЛАДЗІМІРА ДАНІЛЕНКІ — старшынёй Слаўгарадскага райвыканкама (Магілёўская вобласць);

ІГАРА РАДЗЮКА — старшынёй Стаўбцоўскага райвыканкама (Мінская вобласць);

МІКАЛАЯ ПАНЦЯЛЕЯ — кіраўніком адміністрацыі Кастрычніцкага раёна Мінска;

АНАТОЛЯ БУЛЫНЯ — дырэктарам дэпартамента па меліярацыі і воднай гаспадарцы Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання;

СВЯТАСЛАВА ШКОЛЬКА — генеральным дырэктарам дзяржаўнага навукова-вытворчага канцэрна дакладнага машынабудавання "Планар" — дырэктарам рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства "Завод дакладнага машынабудавання "Планар-ТМ".

Акцыя «Дзіцячае сэрца» пройдзе ўвосень

Правядзенне чарговага этапу дабрачыннай акцыі "Дзіцячае сэрца" запланавана на верасень-кастрычнік 2004 года. Яе арганізатарамі традыцыйна выступаюць Беларускі дзіцячы фонд (БДФ) сумесна з Міністэрствам аховы здароўя Беларусі пры падтрымцы грамадскага аб'яднання "Мінскі ротары-клуб", прадстаўніцтва Ірландскай дабрачыннай арганізацыі "Chernobyl children's project" і міжнароднай дабрачыннай арганізацыі "Сафія". У рамках гэтай акцыі беларускія хірургі сумесна з высокакваліфікаванымі спецыялістамі з міжнароднай брыгады спецыялістаў-кардыёлагаў на чале з доктарам Вільямам Новікам правядуць складаныя аперацыі на адкрытым сэрцы дзецям-інвалідам з Беларусі з прыроджанымі парокамі сэрца.

Вольга АСІПЕНКА.

SOS!

Банкам предложили оказать колхозам скорую помощь

Ольга ТОМАШЕВСКАЯ

Правительство Беларуси обратилось к банкам, уполномоченным выполнять государственные программы, с просьбой о предоставлении сельскохозяйственным предприятиям льготных кредитов на сумму 100 млрд. рублей.

Предполагается, что ставка по кредитам составит одну треть ставки рефинансирования, а сами кредиты будут выдаваться под гарантии правительства. Компенсировать банкам две трети ставки рефинансирования и рекомендованный размер маржи планируется за счет уточнения показателей республиканского фонда поддержки сельхозпроизводителей. Все кредиты должны быть выделены к 1 сентября 2004 года. Сельхозорганизации должны будут рассчитаться по ним до 1 сентября 2006 года.

Правительство намеревается направить кредитные средства на реконструкцию и техническое перевооружение животноводческих, молочнотоварных и птицеводческих ферм, а также тепличных комплексов.

По мнению эксперта Независимого института социально-экономических и политических исследований **Валерия Дашкевича,** уполномоченные банки, хоть и без большого энтузиазма, могут выполнить просьбу правительства. В то же время эксперт "Белорусских новостей" отметил, что "наличие таких кредитов не радует банки". "Это ухудшает балансы банков, и в случае изменения ситуации в экономике они могут оказаться в сложном финансовом положении, они будут первыми кандидатами на банкротство", — считает Валерий Дашкевич.

Эксперт предполагает, что в результате оказания очередной помощи сельскому хозяйству банки вынуждены будут отвлекать средства, которые могли бы пойти на кредитование прибыльных проектов.

"Я бы хотел обратить внимание на два момента. В результате предоставления такого рода кредитов ресурсная база банков сжимается, то есть сокращаются объемы ресурсов, которые могли бы быть выделены прибыльным предприятиям. Что касается льготной процентной ставки, то в постановлении указаны источники компенсации средств для банков, что позволяет надеяться, что они не сильно пострадают. С другой стороны, в силу убыточности белорусского сельского хозяйства есть опасность, что кредиты снова достанутся тем сельхозпредприятиям, которые не в состоянии их погасить. В качестве гаранта выступает правительство, но оно часто затягивает исполнение своих обязательств", — сказал Валерий Дашкевич в интервью "Белорусским новостям".

("Белорусские новости".)
Коллаж Александра СИЛИЧА.

Stop, NATO!

Адзіная рэгіянальная групоўка войскаў Беларусі і Расіі знаходзіцца на "вельмі высокім узроўні" гатоўнасці і здольная супрацьстаяць "рэальнай ваеннай небяспецы". Такую думку выказаў намеснік начальніка Генеральнага штаба Узброеных сіл па навуковай працы Міністэрства абароны Беларусі Юрый Партноў, выступаючы ў Мінску на пасяджэнні "круглага стала" па пытаннях выпрацоўкі адзінай знешняй палітыкі Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі. Мерапрыемства было арганізавана Парламенцкім сходам Саюза Беларусі і Расіі.

На думку Ю.Партнова, небяспека Саюзнай дзяржаве можа зыходзіць ад блока NATO, што прасунуўся на Усход. Пра гэта, як мяркуе намеснік начальніка Генеральнага штаба, сведчыць і ўдзел сіл Паўночнаатлантычнага альянсу ў шэрагу рэгіянальных ваенных канфліктаў. "Мы ў любым выпадку будзем уцягнуты калі не ў прамую ваенную сутычку, то ў канфлікт нацыянальных інтарэсаў", — сказаў Ю.Партноў.

Юрый ПАЦЁМКІН.

ПРЭЗЕНТАЦЫЯ

Што там, за Бугам?

1 чэрвеня ў Мінску адкрываецца 5-я нацыянальная выстава «Бізнес-Польшча»

Што там, за Бугам? Такое пытанне часта задаюць тым, хто вярнуўся з суседняй краіны. І нездарма. Перамены ў Польшчы відавочныя, яны выклікаюць у нас вялікую цікавасць. А вось інфармацыі аб іх не хапае. Запоўніць інфармацыйны вакуум і заклікана нацыянальная выстава "Бізнес-Польшча", якая будзе праходзіць у Мінску 1—4 чэрвеня гэтага года.

Дык што ж новае, арыгінальнае змогуць пабачыць наведвальнікі на ёй? Ды многае. Свае вырабы прадставяць каля 140 польскіх фірм. Прадпрыемства "Чарнецкі і сын" паказвае абутак. Ды не абы які, а ўласнага дызайну. Нездарма іх вырабы ідуць на экспарт. Фірма "KWADRAT" прадстаўляе багаты выбар біжутэрыі — бранзалетаў, завушніц, кліпсаў... Нібыта ўсё знаёмае. Але... Вырабы зроблены па эскізах выдатных мастакоў. І таму гэта не проста прыгожыя рэчы, а сапраўдныя творы мастацтва. Каб пераканацца ў гэтым, дастаткова зірнуць на дэкаратыўныя нажы, каробкі для сігар ці банкнотаў. Акцыянернае таварыства "DERMIKA" дэманструе высокага класа касметыку. Яна зацікавіць тых жанчын, якія сур'ёзна сочаць за апошнімі тэндэнцыямі ў сферы амаладжэння свайго твару. Для іх паслуг — 72 касметычныя прэпараты для ўходу за скурай у хатніх умовах і 94 — для 12 працэдур у касметычных салонах.

На выставе прадстаўлены унікальныя вырабы мэблі, тэкстылю, будаўнічых матэрыялаў, харчовай прамысловасці.

Выстава — не толькі паказ вырабаў і дэманстрацыя магчымасцяў краіны. Гэта месца для сустрэч, дыскусій, перамоў, кантрактаў... Таму на прэс-канферэнцыі, якая ладзілася ў Пасольстве Польшчы ў Беларусі, ішла размова аб беларуска-польскім супрацоўніцтве: яго дасягненнях і рэзервах. Пасол суседняй краіны Тадэвуш Паўляк адзначыў, што развіваецца яно даволі плённа. Так, летась гандлёвы абарот вырас амаль на 60 працэнтаў. Польшча стала адным з асноўных знешнегандлёвых партнёраў Беларусі, заняўшы 4-е месца ў беларускім знешнім гандлі пасля Расіі, Германіі і Вялікабрытаніі.

Аднак рэзервы яшчэ не малыя. Адзін з іх — слабая інфармаванасць дзелавых колаў, аб чым сказана вышэй. Другая перашкода — мяжа. Яе перасячэнне выклікае шмат цяжкасцяў. Ужо з'явіўся выраз аб тым, што наша мяжа — гэта "граніца для багатых". Візу купі, за страхоўку заплаці, ды яшчэ ў кішэні трэба мець пэўную суму грошай на кожны дзень. Складзеш усё разам і атрымоўваецца немалая сума, асабліва для простага грамадзяніна. Шмат праблем у фірм, якія вязуць свае тавары ў Беларусь. Амбасадар Польшчы спадар Паўляк лічыць, што адпаведнае ведамства павінна, не адкладваючы на доўгі час, вырашыць згаданыя праблемы.

А яшчэ турбуе польскіх бізнесоўцаў непастаянства сітуацыі, заканадаўства. Вось днямі была нарада на высокім узроўні аб рабоце свабодных эканамічных зон. На ёй агучаны патрабаванні, якія выклікалі занепакоенасць замежных фірм. Была ў эканамічных зонах адна сітуацыя, цяпер, выходзіць, яна істотна мяняецца. Для рынка такія выкрунтасы непрымальныя. Сітуацыя павінна быць стабільнай.

Няўпэўненасць выклікае будаўніцтва саюза Беларусі і Расіі. Калі Беларусь далучыцца да Расіі, дык ці застануцца льготы ў эканамічных зонах ці не? А калі Беларусь і Расія "разыходзяцца", то ці не зменіцца практыка экспарту ва ўсходнюю краіну? Невядома.

Падобныя ды іншыя цяжкасці тармозяць развіццё супрацоўніцтва паміж дзвюма краінамі, якія маюць арыгінальныя рэзервы. Палякі могуць мець немалую карысць з супрацоўніцтва Беларусі і Расіі, а Беларусь — з супрацоўніцтва Польшчы з краінамі Еўрапейскага Саюза. Было адзначана, што ўступленне Польшчы ў Еўрапейскі Саюз паляпшае сітуацыю для беларускага экспарту. Справа за тым, каб паспяхова скарыстаць новыя магчымасці.

Іван МАКАЛОВІЧ.

БИЗНЕС-ЛЕДИ

Хеди РЭТНЕР:

«20 лет назад только 5 процентов бизнеса в Америке принадлежало женщинам»

*На прошлой неделе белорусскую столицу посетила известная бизнес-вумэн Америки — **Хеди Рэтнер**. Среди многочисленных встреч с белорусскими предпринимателями, участия в первом Форуме женщин-предпринимателей Беларуси была запланирована и встреча Хеди с журналистами. Речь на ней шла о развитии женского предпринимательства в США.*

Очаровательная Хеди впервые в Беларуси, хотя давно мечтала побывать в Минске. В белорусской столице родился ее отец. Еще до революции, женившись на красавице-польке, он эмигрировал в США. Хеди и ее сестра родились на чужбине.

В годы Великой Отечественной войны погибли все минские родственники семьи Рэтнер. Связь с родиной прекратилась...

— Я счастлива, что наконец-то я в Минске, в этом красивом, зеленом городе с красивыми людьми, — американская улыбка не сходит с лица Хеди. — Я приехала не только посетить родину своего отца, но и встретиться с белорусками, которые занимаются бизнесом. Я приехала их ободрить, рассказать, какой нелегкий путь становления прошел женский бизнес в США.

Хеди Рэтнер у себя на родине возглавляет Центр развития женского бизнеса, один из крупнейших центров США с годовым бюджетом в 2,5 миллиона долларов. Вместе с партнером она открыла его 20 лет назад, чтобы оказывать консультативную помощь американкам, решившим заняться бизнесом. К слову, сегодня в Соединенных Штатах Америки работает 60 таких центров.

В 1989 году Хеди получила награду "Женщина-предприниматель года". В 1996 году она была включена в список 100 наиболее влиятельных женщин Чикаго. Президент Билл Клинтон назначил Хеди членом Государственного совета по женскому бизнесу.

— В начале 70-х годов в США всего 5 процентов бизнеса принадлежало женщинам, — рассказывает Хеди. — Сейчас — около 50 процентов. 18 миллионов рабочих мест создано благодаря усилиям женщин.

Когда мы начинали работать, банки страны не рассматривали женщин как надежных партнеров и не хотели давать кредиты. Благодаря усилиям неправительственных женских организаций в США было создано Федеральное управление по вопросам малого бизнеса, которое выступает поручителем в банке. Сегодня женщина-бизнесмен может получить ссуду в Федеральном резервном банке США. Я знаю, что в Беларуси нет такой практики, когда Национальный банк инвестирует средства в малые предприятия, которые принадлежат женщинам.

В США действует закон, который обязывает крупные государственные корпорации покупать 5 процентов того, что произведено женщинами-предпринимателями.

— Насколько тяжело было добиться этих льгот?

— Очень тяжело. Например, в США на протяжении 30 лет действовал закон, который обязывал все банки страны поддерживать развитие социальной сферы. Но эта помощь ограничивалась только кредитами на приобретение или строительство жилья. И только за последние 15 лет данное требование было распространено и на коммерческие кредиты. И опять-таки благодаря усилиям женщин-предпринимателей и женских неправительственных организаций.

— Американские бизнесвумэн реализуют себя в чисто женских направлениях бизнеса или посягают на серьезные сферы экономики?

— Женщины-предприниматели представлены в различных секторах американской экономики: и в строительстве, и в агробизнесе. Но, конечно, женщинам проще открывать свое дело в той области, которая им ближе, — в сфере предоставления услуг и розничной торговле. Фитнес-центрами и салонами красоты в Америке владеют в основном представительницы прекрасной половины человечества.

Наиболее динамично в последние годы развиваются "женские" предприятия, численность служащих на которых около 100 человек, а объем продаж — более миллиона долларов в год. На протяжении последних нескольких лет количество таких предприятий выросло на 40 процентов.

— Но если все так благополучно, то почему сегодня женский бизнес в Америке нуждается в поддержке?

— Потому что ни в одной стране мира не созданы равные условия для мужчин и женщин, решивших открыть свое дело или уже работающих в частном бизнесе. Например, в США до сих пор труднее получить корпоративные контракты или государственные правительственные заказы предприятиям, во главе которых стоят женщины, чем тем предприятиям, которыми руководят мужчины.

Сегодня наш Центр и другие неправительственные женские организации лоббируют интересы "женских" предприятий, на которых трудятся сто и более человек. Рассматриваются вопросы о создании для них налоговых льгот и еще больших возможностей для получения кредитов и ссуд.

— Хеди, на Ваш взгляд, есть ли какое-то обязательное условие, без соблюдения которого женщине не стоит начинать свой бизнес?

— Я могу давать только рекомендации. Мой опыт подсказывает, что обычно первые годполтора, как бы успешно ни шло дело, оно не дает прибыли, и у предпринимателя нет возможности "взять" часть средств из дела. Надо рассчитывать так, чтобы на это время работы вам хватило начального капитала.

— Как, на Ваш взгляд, развивается женский бизнес в Беларуси?

— Он только начинает развиваться...

— Хеди, а Вы согласились бы наладить свой бизнес в Беларуси?

— Надо подумать...

Мария ЭЙСМОНТ.

З ЗАЛЫ СУДА

Адкупіліся

У акно бальнічнай палаты закінула сонечнае праменне ясная веснавая раніца. Выдавала, што надвор'е будзе цёплае. Стары Міхась Кудзелька, якога ўрач меўся сёння выпісаць, не радаваўся ні цяплу, ні святлу. Ён сядзеў на ложку, паклаўшы рукі на мыліцы, што стаялі паабапал тулава: відаць, наважыўся выйсці з палаты, ды не асмельваўся. Ужо некалькі тыдняў мінула, як яму ампутавалі нагу, зацягнулася рана, а ён усё ніяк не мог прывыкнуць да свайго калецтва. А яшчэ больш дзеда Міхася душыла думка пра адзіноту і бездапаможнасць. Дзве дарослыя дачкі, якія жылі ў тым жа горадзе на Віцебшчыне, пасля таго як бацька занямог, пачалі адносіцца да яго з прыкметным халадком, і ў старога чалавека былі падставы думаць, што дочкі кінулі яго на волю лёсу.

— Паедзем, тата, на тваю радзіму, на Дзятлаўшчыну, — паведамілі неўзабаве скалечанаму бацьку.

— Чаго? — не зразумеў той.

— А таго, што ты там цяпер будзеш жыць.

— Дзе жыць? Як?

— Да сястры тваёй цябе завязём. Яна няхай і даглядае.

— Дык сястра ж сама старая і ў яе свая сям'я ёсць...

Дочкі не прымалі ніякіх даводаў. Яны прывезлі нямоглага бацьку да такой жа нямоглай цёткі, а самі зноў сабраліся на родную Віцебшчыну.

— Што ж я з ім буду рабіць? — спытала на развітанне цётка. — Не змагу дагледзець...

— А не зможаш, то завязі ў вашу, бацькоўскую, хату і няхай там жыве. Яна ж яшчэ не развалілася, тая хата.

Нейкі час дзед Міхась жыў у сястры, а потым яна і сапраўды завезла яго на бацькоўскае селішча. Даглядаць яго за 100 тысяч рублёў платы ў месяц згадзілася адна вясковая жанчына. Калі сястра наведвалася да брата, то бачыла ў яго вачах смяротную тугу. Няцяжка было здагадацца, адкуль гэта туга бралася: выгадаваў дзвюх дачок, што называецца, у людзі вывеў, як меў здароўе, дапамагаў, чым мог, а яны яго, можна сказаць, пад плот выкінулі. Вось і зыходзіла горкімі слязамі бацькоўскае сэрца.

— Падай на іх у суд, — прапанавала аднойчы сястра. — Уся твая аплата ідзе на аплату сядзелцы. Нават на лекі грошай не застаецца, не тое што на прадукты ці такую-сякую вопратку. Па законе ж яны павінны цябе даглядаць. Я сама паеду ў суд.

І старая жанчына выбралася з далёкай вёскі ў Дзятлаўскі суд, расказала там пра гора, што напаткала брата.

Справе далі ход. Быў вызначаны дзень судовага разбору. Аб гэтым паведамілі на Віцебшчыну Міхасёвым дочкам, павесткамі выклікалі на пасяджэнне. Але яны абедзве, безумоўна, згаварыўшыся, прыслалі ў суд паперы: "У сувязі з занятасцю на працы прыехаць не можам. Просім разгледзець справу без нас. З іскам згодны. Прэтэнзій не маем" (праўда, такое пісала кожная асобна). Словам, дочкі Міхася Кудзелькі згодны былі плаціць любыя грошы на ўтрыманне бацькі-калекі, але каб толькі не бачыць і не чуць яго.

Суд спагнаў з іх у сукупнасці крыху больш за 100 тысяч рублёў. Гэтыя грошы стары бацька будзе плаціць старой жанчыне за тое, што тая яго даглядае, а пенсію пусціць на іншыя патрэбы.

Такім чынам дочкі дзеда Міхася адкупіліся ад яго, лёгка і проста спіхнуўшы на рукі чужога чалавека. Яны будуць працаваць, спакойна спаць, смяяцца, у той час як бацька адзінока гібее ў пустой хаце. Сядзелка ж пры ім не пастаянна. У яе ёсць і свае клопаты. Аб чым думае дзед Міхась, калі зачыняюцца за гэтай спагадлівай жанчынай дзверы? Якія турботы не даюць яму заснуць? Здагадацца няцяжка.

P.S. Імя і прозвішча старога чалавека зменены. Не хачу прычыняць горшага болю, бо яму і так балюча.

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ.

Народная Воля
27 МАЯ 2004 г.

РУБАМ!

За што хапаецца п'яны?

Апошнім часам зноў загаварылі аб прывязцы беларускага рубля да расійскага. У канцы мінулага месяца аб гэтым паведамлялі адказныя асобы Нацыянальнага банка краіны. Называлася нават дата прывязкі, з 1 ліпеня сёлетняга года. І "прывязваць" збіраюцца не проста так, а "жорстка". Пры гэтым некаторыя эканамісты і банкіры сцвярджаюць пра вялікую карысць, якую прынясе краіне гэтая "жорсткая прывязка" беларускага рубля да расійскага.

У такіх спадароў хочацца спытаць: "За што хапаецца моцна п'яны, каб не ўпасці?" Той п'яны, які ледзь трымаецца на нагах і ўжо слаба кумекае? Ён хапаецца рукамі не за такога ж п'янага сябрука, як сам, а за плот ці слуп. Бо нават і ён, у алкагольным ачмурэнні кумекае, што п'яны сябрук — ненадзейная апора, разам з ім можна плюхнуцца ў лужыну. А вось плот, слуп — добрая апора, бо стаяць на зямлі надзейна.

Тое ж і ў жыцці, у тым ліку і ў сферы фінансаў. Які сэнс прывязвацца да расійскага рубля, які сам вагаецца перад доларам і еўра і ў любы момант можа ўпасці? Ці не лепей было б прывязацца да долара ці еўра, як гэта зрабілі нашы некаторыя суседзі і партнёры па былым лагеры сацыялізму? Іхняя прывязка паспрыяла ўмацаванню іх нацыянальных валют. А што прынясе наша?

Яўген ТАЎГЕНЬ.

СЛЫШАЛИ?

В обход

Похоже, уроки из «газовой атаки» сделали только «Газпром» и некоторые западные потребители. Но не Беларусь.

На недавней пресс-конференции руководители "Газпрома" заявили, что они направят все силы на строительство газопроводов в обход Беларуси. Судя по всему, это вовсе не дипломатический ход. Североевропейский газопровод должен быть построен приблизительно к 2007—2008 году и стать альтернативой белорусскому маршруту российского газа в Европу. К тому же руководство "Газпрома" сообщило, что к концу 2004 года будет полностью завершено строительство газопровода Ямал—Европа, который проходит через территорию Беларуси, но принадлежит исключительно "Газпрому". По словам заместителя председателя правления "Газпрома" Александра Рязанова, сейчас проблема в том, что на этом газопроводе недостроены несколько компрессорных узлов, функции которых временно выполняет "Белтрансгаз".

Рязанов также сообщил, что от конфликта "Газпрома" с Беларусью больше не будут страдать Литва и Калининградская область. "Газпром" намерен построить ответвление газопровода из Литвы в Калининград, принять участие в строительстве больших подземных хранилищ газа в Литве, а также "подключить" потребителей этой страны к Североевропейскому газопроводу.

Некоторые СМИ сообщили, что немецкие бизнесмены предложили приложить все усилия для скорейшего создания российско-украинского газотранспортного консорциума и строительства североевропейского газпрома, который не будет проходить по территориям ненадежных стран-посредников.

"Газпром" также приступает к реализации проекта по более эффективному использованию подземных газохранилищ на территории Польши для обеспечения стабильного газоснабжения Западной Европы в случае необходимости. Договоренность об этом достигнута с польскими партнерами.

Только из Беларуси не видно и не слышно озабоченности в поиске "другой, альтернативной трубы". Видимо, страна настолько привязана к российской трубе, что не может даже и подумать о какой-то другой. Но в таком случае в "одно прекрасное время" всей нашей экономике может быть труба.

Сергей ИВАНОВ.

РЕЗОНАНС

Зачем нам мертвая вода?

Так называлась статья депутата Верховного Совета Республики Беларусь 12-го созыва, пенсионера МВД Владимира Станкевича, опубликованная в "Народной воле" 20.03.04 г. В ней подняты проблемы сохранения рыбных запасов в водоемах страны и борьбы с браконьерством. Выступление не оставило читателей равнодушными. Они высказывают свои предложения по решению важной проблемы.

Милиционер возле каждого озера?

Давайте попробуем потянуть за ниточку и размотать весь клубок проблем мертвой воды. На территории Беларуси насчитывается свыше 20 тысяч рек и более 10 тысяч озер. Площадь водного зеркала основных рек (Западная Двина, Неман, Днепр, Припять, Западный Буг) составляет 1028 км², площади озер — 2258 км² и водохранилищ 259 км² (по состоянию на 1976 г.). Это без учета площади остальных рек и водоемов. Если бы с одного гектара вылавливали по 500 кг рыбы, то на каждого белоруса выходила бы рекомендуемая норма потребления рыбы и рыбопродуктов: по 16 кг в год.

В 50-е годы прошлого века на Припяти ежегодно вылавливали рыбы более 6 ц с километра, а современные рыбхозы могут выращивать рыбы еще больше. При правильной организации рыбного хозяйства естественные и искусственные водоемы могут давать высокую рыбопродуктивность.

Ветеран МВД В.Станкевич считает: "А если учесть, что в инспекторы по охране природы зачастую идут неподготовленные, случайные люди, то получается совсем не радостная картина. Впрочем, кому охота за мизерную зарплату идти на весьма опасную работу, пожалуй, не менее опасную, чем у сотрудника милиции". Добавим, что и пенсия у них не милицейская.

Если поставить на каждое озеро и на каждый километр реки по одному милиционеру, то их потребуется сотни тысяч. За год они вполне смогут посадить в тюрьмы тысячи браконьеров. Это такую охрану нужно иметь, чтобы на белоруса вырастало по 16 кг рыбы. А нужна ли она будет с такими затратами?

Милиции у нас и так хватает, в тюрьмах сидят тысячи, причем государство не может придумать, какой работой загрузить заключенных. Благие пожелания не всегда ведут в рай. Сторожей прибавится, а рыбы вряд ли.

Уже к середине 90-х годов прошлого века, по статистическим данным, в водоемах Беларуси было немало нефтепродуктов. Рыбу из такой воды есть нельзя, и рыборазведение в такой воде, по советским нормам, не допускалось. Во многих водных объектах и без нефтепродуктов вода мертвая. Стоит ли увеличивать охрану, сажать в тюрьмы браконьеров за ловлю рыбы из мертвой воды? Вылавливая и съедая такую рыбу, во вред своему здоровью, они дают возможность другим белорусам дожить до пенсии.

Где же хозяин белорусских водных объектов, почему он не занимается реабилитацией водных объектов с мертвой водой? Где же водоохранные зоны, лесопосадки вдоль водных объектов и дорог, где реабилитация водных объектов? Где путь развития совместимый с природой?

Что-то похожее уже проходили. Так, в одно время электрифицировали деревни. Вроде бы благое дело. Но вырезали в деревнях липы, которые мешали тянуть провода и вкапывать столбы. Потом никто не занялся посадкой новых деревьев. Не появились деревья вдоль дорог. Стали больше занимать сельскохозяйственных земель под сахарную свеклу. После этого подрубили, ставшее убыточным, пчеловодство, за природоохранные деньги закупали пестициды для сельского хозяйства. Сократилось потребление меда, а возросло — сахара, появились новые болезни.

Вода становится мертвой от нежелания по-хозяйски использовать ее ресурсы во благо общества.

Михаил БИРИЦКИЙ,
ветеран труда,
бывший заведующий лабораторией регулирования водных экосистем Научно-исследовательского института Комплексного использования водных ресурсов Минприроды Беларуси.



Какую рыбу поймает внук?

Статья В.Станкевича "Зачем нам мертвая вода" меня сильно тронула. Он прав, необходимо бороться с браконьерством. Но, на мой взгляд, этого мало. Да, есть водоемы, где осталась лишь "сорная" рыба: колючка, ерш, уклея, пескарь и прочая мелочь, которая подрывает кормовую базу для более ценных пород. Но кроме браконьеров есть еще сточные воды от производств, которые делают водоемы мертвыми. С ними тоже надо бороться.

Хочу обратить внимание на зарубежный опыт, о котором мне рассказал бывалый любитель поудить рыбу. Арендатор, или собственник, содержащий водоем с ценными рыбами, любителю за небольшую цену половить в его водоеме. Можно получить у него приманку и удочку. Если выловил рыбу, можешь ее отпустить, а если берешь с собой — оплачиваешь ее стоимость. Если хочешь — ее приготовят тебе тут же за небольшую плату.

У нас уже есть кое-что в этом направлении. Есть арендаторы. Они борются с браконьерами днем и ночью, продают более-менее товарную рыбу. Есть надежда, что они позаботятся об улучшении породистости рыб в своих водоемах. В этом вопросе должны сыграть свою роль рыборазведенческие хозяйства. Возможно, надо помочь таким хозяйствам, как наше Березовское, где разводят такие ценные породы, как белый амур, толстолобик, карп. Там же разводят карася, щуку, которые тоже весьма полезны в рыбном хозяйстве. Побольше бы таких рыборазведенческих хозяйств.

Наконец, нужно привлечь энтузиастов в деле рыборазведения. Мы с сыном, не будучи арендаторами, при скромных финансовых средствах, нашли возможность выделить 125.000 рублей на приобретение в Березе 6 кг годовалого белого амура и толстолобика, которыми зарыбили одно мертвое озеро. Лет через 10—15 мой внук выловит здесь рыбину и получит удовольствие. Кому дорога природа, пусть сделают что-то подобное, и мертвой воды не будет.

С уважением

Михаил ХОХА.

Гродно.

Контракты: перед пенсией не увольнять

Министерство труда и социальной защиты Республики Беларусь разработало рекомендации по предотвращению и устранению негативных социальных последствий при переводе работников государственных организаций на контрактную форму найма. В частности, в них предполагается заключение контракта на срок, предусмотренный законодательством, — от одного года до пяти лет. С работниками предпенсионного возраста — женщинами 53 лет и мужчинами 58 лет — контракт должен заключаться не менее чем на срок, оставшийся до достижения общеустановленного пенсионного возраста. В случаях, если срок контракта истекает в период беременности и родов, а также во время отпуска по уходу за ребенком до 3 лет, рекомендуется перезаключать или продлевать контракт на срок не ранее достижения ребенком трехлетнего возраста. Кроме того, рекомендации Минтруда предусматривают обязательное участие профсоюзов при обсуждении содержания контракта с работником.

praca-by.info

Средняя пенсия

Страна	Сумма средней пенсии в евро
Словения	325,4
Польша	200
Венгрия	116,7
Беларусь	около 50

СЛЫШАЛИ?

В третьем квартале Нацбанк начнет девальвацию белорусского рубля к российскому

В третьем квартале текущего года Национальный банк Беларуси будет осуществлять девальвацию белорусского рубля к российскому в соответствии с Основными направлениями денежно-кредитной политики страны. Такая договоренность достигнута в Гомеле в ходе очередного заседания Межбанковского валютного совета Союзного государства, сообщили РИА "Новости" в пресс-службе Национального банка Беларуси.

Заседание прошло под руководством глав Центральных банков Беларуси и России Петра Прокоповича и Сергея Игнатьева. В пресс-службе сообщили также, что центральные банки начинают подготовку материалов к очередному заседанию Совета министров Союзного государства.

Сначала материалы по вопросу готовности сторон к введению российского рубля в качестве платежного средства на территории Беларуси будут представлены в национальные правительства двух стран, а затем на заседание Союзного правительства, которое пройдет 8 июня в Минске, сообщили в пресс-службе Нацбанка.

Профильным подразделениям центральных банков двух государств поручено доработать документы о порядке осуществления межбанковских расчетов в платежной системе Союзного государства, иных нормативных актов, сообщили в белорусском главном финансовом ведомстве.

Очередное заседание Межбанковского валютного совета намечено провести в конце третьего квартала нынешнего года в России.

ЖЫЦЦЁ ЯК ЯНО ЁСЦЬ

Капрамонт

Паважаныя кватэранаймальнікі! Ці ведаеце вы пра тое, як уваходзіць "капрамонт" у нашы ўтульныя кватэркі шматпавярховак? Калі дазволіце, я прапаную Вам невялічкую замалёўку з уласнага вопыту.

Здаецца, мы ўдзельнічалі ў эксперыменце па выжыванні ў экстрэмальных сітуацыях. Нам давялося прайсці тэст на трываласць псіхікі, раскрыць невычэрпныя здольнасці чалавечай прыроды, бязмежны патэнцыял беларуса, яго дзіцячую веру ў навядзенне парадку, безвыніковыя пошукі праўды сярод чыноўнікаў і, урэшце, спадзяванне толькі на свае (заўважце!) не галаву, горла ці доўгі язык, а працоўныя рукі.

...Трубы пачалі мяняць з першага паверха і далей. Таму на працягу тыдня заходзіць у прыбіральню было вельмі рызыкоўна. Пэўны час мы жылі без вады. Не толькі без гарачай і халоднай, але і без умывальнікаў і ваннаў. Затое колькі іх было пакідана-пакінута каля пад'езда: падышоў да акна і любуйся, калі ласка, цэлая выстава. Камусьці пашчасціла пабыць без вады ўсяго толькі тыдзень, а каму і два. А якія бясплатныя лічыльнікі на ваду. Адна жанчына казала, што навучылася мыць посуд так, каб яе лічыльнік у гэты час не круціўся. Атрымліваецца — бясплатна. Праўда, здараюцца і адваротныя выпадкі: пенсіянер вадой не карыстаецца, а лічыльнік працуе на ўсю моц, нібы зачараваны.

Потым паставілі лічыльнікі і на газ. Таксама бясплатна. Відаць, гэта была своеасаблівая ўзнагарода за тое, што доўга чакалі падключэння газу. Тэрмін выжывання без газу складаў у сярэднім паўтара месяца. Прытым некаторыя кватэранаймальнікі цяпер ужо самі расцягвалі межы эксперымента: ніяк не наважваліся заключыць дамову на карыстанне газам. А без абавязковай дамоўленасці з дзяржавай некалькіх "несвядомых элементаў" — ніяк! Вось усім астатнім і даводзілася чакаць. Што ж зробіш?! За гэты час умывальнікі і ванны кудысьці зніклі, а іх месца пад вокнамі занялі старыя газавыя пліты. Такім чынам, паўгода мы маглі бясплатна мець перад вачыма самыя апошнія постмадэрновыя краявіды.

Пра працу капрамонтнікаў. Адразу клалі толькі адзін рад плітак, а потым суткі чакалі, ці не абваліцца. Аднаму чалавеку яны паклалі плітку і атрымалі разлік. Але праз тры дні амаль уся яна ў ванным пакоі паабвальвалася і пабілася. Другі чалавек таксама аказаўся вельмі даверлівым: заплаціў грошы наперад і пасля доўга чакаў, бегаў, нешта некаму даказваў, спрачаўся, сварыўся...

Увогуле, мы ўжо даўно прызвычаіліся бачыць кожную раніцу бабулю, жанчыну, мужчыну, якія пільнуюць начальніка ці чарговую камісію, каб паскардзіцца. Але ўсё дарэмна. Так і вяртаюцца яны дадому, распавёўшы сваю крыўду...

Праз месяцы наша нервовая сістэма ўжо больш спакойна рэагавала на стукат і грукат. Мы менш злавалі і спадзяваліся толькі на сябе. Але тады пан "капрамонт". Ён увайшоў у калідор і пачаў бяліць столь, фарбаваць сцены. Першай не вытрымала прыбіральшчыца. Паколькі бялілі і фарбавалі ў хаатычным парадку (адразу на ўсіх паверхах і так цэлы месяц), яна стамілася і пакінула змагацца за чысціню. А нас чакалі новыя сюрпрызы.

Абарвалі провад ад дамафона. Тройчы. Дайшла чарга да тэлефоннага провада: кабеты-маляры так старанна шкрэблі сцены, што разам з пабелкай сашкрэблі, ці лепш сказаць "адкусілі", гэты металічны дрот. Прывесці да ладу ўласнымі сіламі яго не ўдалося. Выклікалі тэлефонных майстроў, яны загадалі мяняць усю праводку. Яшчэ пажартавалі: дзякуйце, што хоць радыё размаўляе. Дык праз месяц змоўкла і радыё...

...Доўга год жалезныя дзверы ў нашым пад'ездзе не зачыняліся. А зусім нядаўна памянялі кодавую дамафонную сістэму, без папярэджання, таму патрапіць у пэўны час не маглі не толькі чужыя, але нават і свае. Вось такія рамонтныя турботы.



Т.ДЗЯДЗЮЛЯ.

Мінск.

Так в чем же хранить сбережения: в долларах или евро?

Прогнозы 50 «китов» мировой финансовой индустрии

К концу этого года курс евро может подняться до уровня 1,36 доллара. А может и упасть до отметки 1,07. Но средний ожидаемый курс составляет умеренные 1,24 доллара за евро. Таковы результаты опроса валютных трейдеров и управляющих валютными активами 50 крупнейших банков, проведенного агентством Bloomberg.

Среднее арифметическое 50 взглядов на будущее доллара, выраженных главными игроками мирового валютного рынка, выглядит неожиданно взвешенно. Последнее время рынок жил в предчувствии стремительного падения доллара относительно корзины главных мировых валют.

Для этого у его участников было по крайней мере две причины. Учетная ставка Федеральной резервной системы (ФРС) США, равная сейчас 1%, остается на самом низком уровне с 1958 года, и ее повышение ожидается не раньше первых месяцев 2005-го. Низкая стоимость кредитов отбивает у иностранных инвесторов желание покупать активы, номинированные в долларах, например, долговые обязательства американских корпораций. Другой фактор удешевления доллара — рекордный дефицит текущего счета платежного баланса Соединенных Штатов, учитывающего финансовые трансакции и внешнюю торговлю. В прошлом году он достиг 541,8 млрд. долларов. Гипнотическое действие этих двух показателей не было ослаблено даже тем фактом, что после прошлогоднего 17-процентного падения относительно евро доллар вырос за первые три месяца этого года на 2,3%, а сообщения о быстром росте занятости в США, появившиеся в апреле, почти удвоили этот выигрыш.

Несмотря на такое развитие событий, киты мировой финансовой индустрии сохранили невозмутимость и продолжают придерживаться своих прежних оценок. Нью-йоркская Citigroup, крупнейшая инвестиционная компания планеты, ведущая вторую по объемам валютную торговлю, ожидает, что через год курс американской денежной единицы составит 1,32 доллара за евро. Франкфуртский Deutsche Bank, делавший в конце прошлого года самые точные валютные прогнозы, на конец этого прогнозирует примерно такое же соотношение — 1,33 доллара за евро.

Как считает Майкл Розенберг, глава нью-йоркского отдела исследований валютного рынка Deutsche Bank, свой вклад в ослабление доллара внесет, как ни странно, даже усиление американской экономики. По его мнению, оно вызовет в США рост спроса на импортные товары. А это, в свою очередь, приведет к очередному увеличению внешнеторгового дефицита. В отличие от многих других Розенберг полагает, что уже к декабрю учетная ставка ФРС вырастет до 1,5%, но и это "слишком маленький шаг", учитывая соотношение рисков и преимуществ инвестирования в американскую экономику. За ближайшие пять лет пресловутый дефицит во внешней торговле США вырастет с 4,9% до 8% ВВП. В течение двух-трех лет, считает он, это должно привести к падению доллара на 20—30%.

Самой радикальной точки зрения придерживается японский Mizuho Corporate Bank, прогнозирующий обесценивание мировой валюты до 1,36 доллара за евро. Почти такой же прогноз у J.P. Morgan Chase, HSBC и BNP Paribas — 1,35 доллара за евро.

Однако из этого слаженного хора выбивается голос диссидентов, участие которых и скорректировало общий итог. Самый решительный из них — Fortis Bank. По его оценке, доллар заметно вырастет и встретит новый год на отметке 1,06 доллара за евро. Предполагаемая причина — будущее сокращение разницы учетных ставок ФРС и Европейского центрального банка.

Новы аўтацэнтр

Афіцыйны дылер "Форд Мотарс" на беларускім рынку кампанія "Ліберці Мотарс", што ўваходзіць у склад холдынга "Атлант-М", адкрыла ў Мінску новы аўтацэнтр.

Як паведаміў рэгіянальны кіраўнік холдынга "Атлант-М" Віктар Астрэйка, адкрыты ў Мінску аўтацэнтр поўнага цыклу гатовы прапанаваць кліентам новыя аўтамабілі, а таксама якаснае абслугоўванне і сервіс. Інвестыцыі холдынга "Атлант-М" у стварэнні аўтацэнтра склалі каля 1 млн. долараў ЗША.

Летась у Беларусі было прададзена каля 200 новых аўтамабіляў "Форд", у тым ліку, 86 — цераз "Ліберці Мотарс". Сёлета кампанія "Ліберці Мотарс" прадала ўжо 50 машын. Усяго, паводле ацэнак прадстаўнікоў кампаніі, у 2004 годзе ў Беларусі будзе прададзена каля 400 аўтамабіляў "Форд".

Аляксей АРЭШКА.

З пачатку года спажывецкія цэны ўзраслі на 7,5 працэнта

З пачатку года спажывецкія цэны ўзраслі на 7,5 працэнта (за аналагічны леташні перыяд — на 11,1).

Афіцыйны прагноз інфляцыі на 2004 год складае 14—18 працэнтаў. Такім чынам, прагноз "выкананы" на 54 працэнты па ніжняй планцы і на 42 працэнты па верхняй.

Дзмітрый УЛАСАЎ.

АВТОРИТЕТНОЕ МНЕНИЕ

Диагноз и рецепты Милтона Фридмана

Недавно в Москве состоялась международная конференция "Либеральная программа для нового века: глобальный взгляд".

Интересно, что ее открыл... Милтон Фридман, лауреат Нобелевской премии по экономике, самый авторитетный в мире экономист. Правда, открыл не "живьем", а в видеозаписи. Но это сути не меняет. Интересно и полезно его суждение. Ведь именно по его рецептам выросли многие "экономические тигры".

В своем выступлении он дал оценку и советы России, но они полезны и Беларуси. Так что же сказал Милтон Фридман?

Он вынес окончательный приговор плановой экономике: "естественный эксперимент между коллективистским обществом и обществом свободных рыночных отношений" закончился не в пользу первого. Затем поставил главный вопрос: как строить истинно либеральную модель экономики? И сам же на него ответил, заодно признав свои ошибки: "Когда пятнадцать лет назад меня впервые спросили об этом, у меня был простой, бесхитростный ответ, состоявший из трех слов: приватизация, приватизация, приватизация. Опыт минувших лет, однако, показал, что это был упрощенный ответ. Его следовало расширить по крайней мере еще двумя пунктами: обеспечение правовых рамок для частной собственности и обеспечение разумно стабильной денежно-кредитной политики".

Затем нобелевский лауреат назвал еще один немаловажный для России пункт: надо сокращать долю госрасходов в экономике, особенно странам, идущим от плана к капитализму. Причем равняться надо не на нынешний объем госрасходов в развитых странах (например, в США он составляет 40% ВВП), а на тот уровень, который был у них много лет назад, тогда он не превышал 10%.

Советник российского президента Андрей Илларионов согласился с выводами Милтона Фридмана и сделал анализ развития мировой экономики. Из его доклада следовало, что те страны, которые в последние 50 лет четко следовали названным Милтоном Фридманом рецептам да еще ликвидировали барьеры во внешней торговле, показали чудеса экономического роста. Например, на Тайване ВВП на душу населения за 50 лет вырос в 18 раз (для сравнения: в России за 100 лет — всего в 2,4 раза). В то же время во многих странах этот показатель упал из-за того, что они не расширяли экономическую свободу.

Почему экономический рост России несоизмерим с тайваньским? Одну из главных причин, по мнению участников конференции, назвал Милтон Фридман: это неудовлетворительное обеспечение правовых рамок для частной собственности.

В ходе конференции было отмечено: чрезмерное госрегулирование порождает коррупцию, расширение монопольного сектора, к тому же при нем не работает судебная система, законы не выполняются. Что в конечном счете блокирует развитие экономики.

Сергей ИВАНОВ.

МЕРКАВАННЕ

Чыноўнік ці гаспадар,

або Як рэфармаваць вёску?

Шмат разоў кіраўнікі Беларусі давалі народу абяцанні, што ў хуткім часе будзе забяспечана прыярытэтнае развіццё сяла і створана багацце танных прадуктаў харчавання. Такія ж абяцанні гучаць і сёння з вуснаў высокага начальства. На самай жа справе амаль нічога не зроблена, каб сапраўды забяспечыць прыярытэтнае развіццё сельскай інфраструктуры.

Замест абяцанага багацця таннага харчавання ў краіне назіраецца спад аб'ёмаў сельгасвытворчасці і высокі рост цэн на прадукты. Сельскія гаспадаркі, за невялікім іх выключэннем, апынуліся на мяжы фінансавага банкруцтва. У іх няма ўласных грошай на набыццё тэхнікі, запчастак, угнаенняў, паліва. Адным словам, апынуліся карміцелі краіны, а значыць, разам з імі і ўсе мы ля разбітых ночваў.

Давайце ж паразважаем аб прычынах таго эканамічнага крызісу і аб шляхах выйсця з яго. Звернемся да лепшага вопыту заходніх краін, дзе аграрны сектар дзейнічае стабільна і высокаэфектыўна. Там ад 30 да 60 працэнтаў фермерскіх даходаў складваюцца за кошт праграм дзяржаўнай дапамогі, хаця мяса, малака і іншых прадуктаў у тых краінах досыць. Наш жа ўрад за апошнія гады дазволіў сабе некалькі разоў абрабаваць беларускіх сялян на мільярды рублёў, прымусіўшы іх прадаць сваю прадукцыю па жорстка фіксаваных цэнах.

Сёння ўсе слаі насельніцтва зацікаўлены ў хутчэйшым выхадзе з крызісу. А ён у сельскай гаспадарцы знаходзіцца на шляху зямельнай рэформы, рэфармавання адміністрацыйна-каманднай сістэмы, пры якой хлебароб не з'яўляецца гаспадаром на зямлі, а наёмным падначаленым работнікам, які і зарабляе мала і працуе кепска. Вопыт працы па-новаму ёсць. Гэта калгас "Рассвет" імя Арлоўскага. Вось яго і трэба распаўсюджваць. Ды фарміраванне шматкладнай рынкавай эканомікі ў аграпрамысловым сектары ідзе надзвычай марудна. У многім гэта абумоўлена тым, што ў краіне адсутнічае заканадаўства, якім рэгулюецца працэс прыватызацыі прадпрыемстваў АПК з улікам іх спецыфікі.

Хачу адзначыць, што прыватызацыя сельскагаспадарчых прадпрыемстваў не ставіць сваёй мэтай раздзел маёмаснай уласнасці на дробныя абасобленыя вытворчасці. Галоўная яе задача — змена форм вытворча-эканамічных адносін у гаспадарках, павышэнне эканамічнай матывацыі вытворцаў, захаванне буйной вытворчасці на новай якаснай аснове шляхам пераўтварэння наёмнага работніка ў працаўніка-ўласніка.

Сусветны вопыт сведчыць, што кааперацыя ў большасці сваёй выступае як форма сумеснай дзейнасці ўласнікаў — членаў калектыву. У гэтай сувязі нашы сельскія гаспадаркі не прадстаўляюць сабой кааператываў таму, што маёмасць у іх абагульнена і часткова адзяржаўлена. Нельга мірыцца з сітуацыяй, калі група кіраўнікоў гаспадарак, прыкрываючыся "нічыйнай" агульнай калектыўнай уласнасцю разбазарвае сродкі, нажытыя працоўнымі калектывамі, дзеля асабістай нажывы.

Лічу, што найлепшым выйсцем са становішча з'яўляецца прыватызацыя гаспадарак і іх трансфармацыя ў эканамічна жыццяздольныя фермерскія асацыяцыі і кааператывы. Члены гаспадарак самі змогуць прымаць на работу і звальняць кіраўнікоў, якія будуць адказваць за якасць, захаванне, перапрацоўку і продаж вырабляемай прадукцыі. Такім чынам, асноўнай мэтай для іх стане эканамічна выгадная вытворчасць высакаякаснай прадукцыі як для ўнутраных, так і для знешніх спажыўцоў. Тыя члены гаспадаркі, якія не хочуць прымаць удзел у вытворчасці сельгаспрадукцыі, атрымаюць магчымасць здаваць свае ўчасткі зямлі ў арэнду і працаваць у сферы перапрацоўкі або збыту. А будучы акцыянерамі разлічваць на сваю долю прыбытку!

На мой погляд, законы аб зямлі, аб уласных фермерскіх гаспадарках, сельскагаспадарчых банках і крэдытах, падаткаабкладанні, прыватнай уласнасці на зямлю патрабуюць перагляду, бо існуючыя з'яўляюцца тормазам эканамічных рэформ АПК. Маё меркаванне: ва ўмовах рынкавай эканомікі калектыўная сельская гаспадарка не можа дасягнуць поспеху. Хіба ж не бачна, што калектыўная арганізацыя працы па адзіным плане вядзе да адных і тых жа сумных вынікаў: згортвання ініцыятывы і прадпрымальнасці, распаўсюджвання безадказнасці чыноўнікаў, раўнадушша да працы, фарміравання ўтрыманскай псіхалогіі. І наадварот: асабістая праца ў прыватнай гаспадарцы выратавала нас ад вымірання. Зараз мы бачым згубныя вынікі, нанесеныя сельскай гаспадарцы валюнтарызмам некаторых палітыкаў, і іх трэба тэрмінова выпраўляць.

Алесь ЗАРАНОК,
эканаміст.

Калінкавіцкі раён.

Народная Воля
27 МАЯ 2004 г.

Швейцария отказывается вводить евростандарты на тайну банковских вкладов

В то время как правительство Швейцарии ведет переговоры с Евросоюзом, отстаивая нерушимость тайны банковских вкладов, в самой отрасли разгорелся спор об "этичности" этой тайны.

Закон с 1934 года требует от швейцарских банков соблюдения тайны вкладов их клиентов. Банкам-нарушителям закона грозят крупные штрафы, а менеджерам — тюремное заключение. Единственным условием раскрытия тайны является подозрение в коррупции или в отмывании денег.

Хотя банковскую тайну придумали не в Швейцарии, население именно этой страны горячо поддерживает этот институт: три четверти швейцарцев выступают против отмены банковской тайны, требуемой Евросоюзом и в случаях, когда владелец вклада уклоняется от уплаты налогов.

Проблема, однако, в том, что швейцарское законодательство считает неуплату налогов правонарушением, но не преступлением, влекущим за собой отмену в каком-либо конкретном случае банковской тайны. Один из швейцарских банкиров — вышедший на пенсию Ханс Бэр — заявил недавно, что не видит большой разницы между правонарушением и преступлением, вот почему сохранение банковской тайны "неэтично".

Согласно заявлению пресс-секретаря отраслевого объединения (SBVg) Назона, "если граждане какой-либо страны не платят налогов, то это значит, что что-то не в порядке с доверием граждан к своему государству". Швейцария между тем с готовностью оказывает помощь иностранным государствам в юридическом преследовании тех, кто злостно обманным путем уклоняется от уплаты налогов, но не в отношении недоимщиков.

В основе нынешнего спора с ЕС лежит 51-я статья соглашения между Швейцарской конфедерацией и Европейским Союзом, соблюдение которой могло бы вынудить швейцарские власти покончить с такой дифференциацией и предоставлять Евросоюзу сведения, ныне защищаемые законом о тайне вкладов. Особенно острой критике подверг швейцарских коллег министр финансов Ханс Айхель, вследствие чего в начале марта этого года имело место одностороннее ужесточение таможенного контроля на германо-швейцарской границе, снятое лишь после встречи министров иностранных дел двух стран. Тайна вкладов делала Швейцарию желанной страной для сотен тысяч самых богатых людей мира, что приносило и приносит альпийской стране огромные доходы. Трудно поверить, что снятие торговых барьеров между Швейцарией и ЕС компенсирует потери от возможной отмены этой тайны.

Парижский аэропорт ударил по пекинской опере?

Трагедия в парижском аэропорту вызвала многочисленные комментарии в печати. Что стало ее причиной? Какой резонанс ожидается в Европе и мире? Вот основные темы публикаций.

"Терминал смерти был построен наспех", — этот заголовок в "Таймс" суммирует то, как все британские газеты прокомментировали крушение участка второго терминала в парижском аэропорту имени Шарля де Голля.

Как пишет парижский корреспондент "Таймс", "терминал 2Е был больше, чем просто пристройка к старому аэропорту: он был призван символизировать современную Францию. Эта изящная конструкция с полностью застекленной оболочкой должна была демонстрировать красоту и устремления Франции авиапассажирам со всего мира". Что же касается причин, которые могли привести к обвалу этого амбициозного символа, то газета приводит слова непоименованного рабочего, который участвовал в строительстве терминала: "Кто-то допустил какую-то ошибку. Новое здание просто так не рушится". Развивая эту мысль, "Таймс" со ссылкой на другие источники рассказывает о том, как открытие терминала несколько раз откладывалось, и как в июне прошлого года, за несколько дней до официальной церемонии, на комиссию, которая пришла принимать здание, с потолка посыпались осветительные приборы.

С тем, что причина воскресной трагедии вероятнее всего кроется в технических недоделках, соглашаются и другие газеты. "Файнэншл таймс" указывает на то, что французский министр по делам транспорта Жиль де Робен категорически исключил возможность теракта, а "Гардиан" размышляет о том, как авария в аэропорту имени де Голля может отразиться на развитии авиаперевозок в Европе.

Согласно первоначальным планам, строительство второго терминала должно было быть завершено в 2007 году. Авиакомпания Air France и французские власти надеялись, что с его помощью аэропорт станет главным авиатранспортным узлом Европы. Сейчас таковым является лондонский Хитроу, где тоже идет строительство нового терминала — правда, не второго, а уже пятого. Более того, одна часть нового парижского терминала предназначается специально для европейского аэробуса нового поколения, А380, который должен вмещать 555 пассажиров. Теперь, подытоживает "Гардиан", эти планы придется корректировать, и посадка новых аэробусов в Шарле де Голле откладывается, возможно, на несколько лет.

А "Индепендент" пишет о том, как катастрофа во втором терминале может отразиться на его создателе, знаменитом французском архитекторе Поле Андрё. Андрё спроектировал и первый терминал Шарля де Голля, завершенный в 1974 году. Тогда его проект был признан революционным для зданий такого рода. С тех пор 65-летний архитектор участвовал в создании более 40 аэропортов по всему миру, в том числе в Абу-Даби, Джакарте, Каире и Осаке.

Его последний заказ — здание оперы на 2,5 тысячи мест в центре Пекина, рядом с площадью Тяньаньмынь. Проект Поля Андрё предполагает возведение гигантского купола из стекла и титан посреди искусственного озера. Эти планы вызывали много споров, и строительство неоднократно откладывалось. "Индепендент" замечает, что теперь, после парижских событий, эта идея вызовет новые сомнения, и судьба новой пекинской оперы окажется под большим вопросом.

ДУХОЎНЫ СКАРБ

Энцыклапедыя «Народнай волі», выпуск №80

Міхал Казімір Агінскі

«Гетман-кларнет», які ўпрыгожваў свет

У сям'і троцкага ваяводы Тадэвуша Юзафа Агінскага і яго жонкі Ганны, у дзявоцтве Вішнявецкай, у 1728 годзе нарадзіўся сын, якога бацькі назвалі Міхалам Казімірам. Агінскія — адзін са старадаўніх магнацкіх родаў. Сваё паходжанне яны выводзілі ад Рурыкавічаў.

Міхал Казімір рана страціў бацьку. Апекуном яго спачатку быў дзед па матчынай лініі гетман Вішнявецкі, а калі ён у 1744 годзе памёр, аб ім рупіўся блізкі сваяк — віцебскі ваявода Марцыят Агінскі. Аднак і гэта доўжылася нядоўга, бо ў справу ўмяшаўся нават сам кароль, і са згоды яго чарговым апекуном Міхала Казіміра стаў князь-канцлер Міхал Чартарыйскі, які, безумоўна, аказаў немалы ўплыў на фарміраванне ягонага светапогляду, шмат паспрыяў у атрыманні належнай адукацыі.

Праўда, наконт грунтоўнасці адукацыі Агінскага даследчыкі разыходзяцца. Адны схільны меркаваць, што Міхал Казімір усё ж меў па асноўных навуках павярхоўныя веды. Іншыя ж упэўнены, што ў авалоданні імі праявіў сябе належным чынам. Добра разбіраўся нават у галіне механікі, але асноўнай ягонай схільнасцю былі музыка і выяўленчае мастацтва. Няблага маляваў, а таксама навучыўся ігры на скрыпцы і арфе.

18 верасня 1744 года яму даверылі пасаду вялікага літоўскага вінчэрпія. 20 чэрвеня 1748-га быў прызначаны польным літоўскім пісарам. Яшчэ праз тры месяцы, 20 верасня 1748 года, прысвоілі званне генерал-маёра. У тым жа годзе, калі праходзілі чарговыя выбары ў сейм, стаў дэпутатам. На гэты ж час прыпадае і ўпарадкаванне яго маёмасных спраў. Да атрыманых каронных маёнткаў потым была далучана Пінская эканомія, а яшчэ пазней шэраг староствaў, у прыватнасці такія, як Чачэрск, Мерач, Пінск і іншыя. Аб'яднанне іх з багатай спадчынай бацькі адразу ж зрабіла Міхала Казіміра вельмі багатым чалавекам.

Пасля гэтага падаўся за мяжу. У Парыжы пазнаёміўся з Дзідро. Паспрыяла гэтаму тое, што Міхалу Казіміру быў заказаны артыкул пра арфу для першага выдання Французскай энцыклапедыі, што само па сабе сведчыць аб значнасці ягоных пазнанняў у галіне музыкі. А ёю захапляўся і Дзідро. У тым ліку і ігрой на арфе. Выказваецца меркаванне, што не хто іншы, як Агінскі вынайшаў для арфы падножку. Хутчэй за ўсё Дзідро слухаў і ігру Міхала Казіміра на скрыпцы, бо, па некаторых сведчаннях, ён і скрыпкай валодаў гэтаксама дасканала, як і арфай.

Сталіцу Францыі ён пакідаў па настойлівай просьбе свайго апекуна Чартарыйскага. Адна з прычын Міхалу Казіміру была добра вядомая: 12 кастрычніка 1760 года памёр падканцлер літоўскі Міхал Антон Сапега, трэцяй жонкай якога з'яўлялася дачка Чартарыйскага Аляксандра. І Чартарыйскі хацеў, каб яна стала жонкай Агінскага. І сам Міхал Казімір быў не супраць гэтага.

Вяселле гулялі ў Волчыне 18 кастрычніка 1761 года — праз год і шэсць тыдняў пасля смерці папярэдняга мужа Аляксандры. Лёс наканаваў ім быць жонкай і мужам трыццаць сем гадоў (Аляксандра памрэ 28 жніўня 1798 года). Менавіта быць, але не жыць, бо хутка зразумелі, што па сутнасці чужыя адзін аднаму. На адчужанасць шмат паўплывала і тое, што не мелі дзяцей. Аляксандра ў асноўным турбавалася сваёй рэзідэнцыяй у Седльцах, дзе і жыла, а Міхал Казімір паступова ўсё больш пачаў любіць Слонім.

Слонімская эканомія дагэтуль належала Міхалу Антону Сапегу, які, трэба аддаць яму належнае, апекаваўся навукамі. Але менавіта пры Агінскім гэты, на той час невялікі гарадок, набыў сусветную вядомасць, ператварыўшыся ў сапраўдную "сядзібу музаў", стаўшы "палескімі Афінамі", як называлі Слонім тыя, каму тут пашчасціла пабываць. Праўда, саму рэзідэнцыю Агінскі пашырыў, шмат займаўся павелічэннем тэрыторыі парку, узвядзеннем новых будынкаў, тым самым пераўтвараючы яе ў непаўторны паркавасядзібны ансамбль.

Але ў Слоніме ён з'явіўся не адразу. Пасля жаніцьбы з жонкай паехаў у Пецярбург, але разам з ёй там знаходзіўся нядоўга. Аляксандра хутка пакінула сталіцу Расіі і паехала ў свой маёнтак. Адлучаўся з Пецярбурга і сам Міхал Казімір, але па іншай прычыне. У 1762 годзе арганізаваў абарону Волчына і, нягледзячы на адсутнасць ваеннага вопыту, дзейнічаў так паспяхова, што яму прапанавалі пасаду віленскага ваяводы, але ваяводам так і не стаў, бо вымушаны быў адмовіцца ад гэтай пасады на карысць Караля Станіслава Радзівіла, больш вядомага як Пане Каханку. А тут яшчэ ім па-сапраўднаму зацікавіўся дацкі пасол у Варшаве Зігфрыд фон Остэн.

Калі не стала караля Рэчы Паспалітай Аўгуста III, Остэн далучыўся да закулісных гульняў адносна будучага стаўленіка на каралеўскі трон і пачаў ускладаць на Міхала Казіміра вялікія спадзяванні, як на таго, хто можа стаць яго фаварытам. У сітуацыі, якая ўзнікла, апошняе слова заставалася за расійскай імператрыцай. Кацярына II спачатку паставілася да яго прыхільна, але потым Міхал Казімір ёй чымсьці не спадабаўся. А каралеўскі прастол, як вядома, заняў Панятоўскі, дарэчы, кузен жонкі Агінскага.

У гэты цяжкі для яго момант руку падтрымкі прапанаваў Пане Каханку. Перад тым, як апынуцца ў эміграцыі, Караль Станіслаў прысвоіў яму тытул віленскага ваяводы і перадаў шэраг сваіх маёнткаў, а таксама квартал Юрыдыка ў Вільні. Падаранымі маёнткамі Міхал Казімір валодаў да вяртання Пана Каханку з эміграцыі, пасля чаго аддаў іх законнаму гаспадару. За гэта Караль Станіслаў 29 лютага 1768 года ўручыў яму булаву вялікага гетмана літоўскага.

7 верасня 1771 года Агінскі далучыўся да ўдзельнікаў Барскай канфедэрацыі — ваенна-палітычнага аб'яднання часткі польскай шляхты і некаторых магнатаў Рэчы Паспалітай для барацьбы супраць Панятоўскага і Расіі. І са сваім войскам смела рушыў на расійскія пазіцыі. Адбылося, здавалася б, немагчымае: Агінскі пад Бездзежам разбіў праціўніка. Але войскі Суворава ў ноч з 22 на 23 верасня 1771 года акружылі яго атрады і разграмілі іх. Сам Агінскі, праўда, уцёк праз акно, калі хату, у якой знаходзіўся, акружалі расійскія салдаты.

Падаўся за мяжу, але ні ў Берліне, ні ў Вене так і не знайшоў паразумення. Пасля гэтага ўскладаў немалыя спадзяванні на сустрэчу з Людовікам VI. Аўдыенцыі з ім дамогся 6 жніўня 1772 года, аднак і яна нічога канкрэтнага не дала. Не заставалася нічога іншага, як у канцы 1774 года вяртацца на Радзіму.

Яго ўладанні, што знаходзіліся за рускай мяжой, секвесціравалі, а потым і ўвогуле канфіскавалі — так Кацярына II пакарала Агінскага за выступленне супраць Расіі. Для паляпшэння фінансавага становішча мусіў і частку сваіх маёнткаў прадаць пляменніку Міхалу Клеафасу Агінскаму. Адабраныя ж уладанні спрабаваў вярнуць. Каб дабіцца праўды, звяртаўся і да самой імператрыцы, і да іншых уплывовых асоб, але гэта нічога не дало. У гэты, вельмі цяжкі і неспрыяльны для яго час, і вырашыў зрабіць Слонім сваёй галоўнай рэзідэнцыяй.

У шэрагу першаступенных планаў Міхала Казіміра было і будаўніцтва асобнага тэатральнага памяшкання, у якім маглі б ставіцца оперныя спектаклі, так званага "Опергаўза". Для ажыццяўлення сваёй задумы запрасіў вядомага італьянскага дэкаратара Іначэнца Мараіна, які апроч гэтага праславіўся і як выдатны архітэктар па ўзвядзенні тэатральных будынкаў. Мараіна, азнаёміўшыся з ваколіцамі замка, заявіў, што найлепшае месца для "Опергаўза" — участак за замкам поруч з ракой. З такой прапановай Агінскі пагадзіўся і 21 красавіка 1780 года падпісаў з Мараіна кантракт. Пасля гэтага і пачаліся будаўнічыя работы, якія вяліся вельмі хутка.

А як выглядаў "Опергаўз", сёння можна даведацца па тых сведчаннях, што дайшлі да нашых дзён. Паколькі тады ў Вялікім княстве Літоўскім асабліва славіўся Радзівілаўскі тэатр, дык слонімскі міжволі параўноўвалі з ім. Гэтае супастаўленне, праўда, было не на карысць таму, які узвёў Мараіна, бо ён з'яўляўся ў два разы меншым за нясвіжскі, які меў не двух'-ярусныя, а чатырох'ярусныя ложы. Але гэта ніякім чынам не паўплывала на ўнутранае аздабленне. У кожнай ложы, як і ў лепшых тагачасных тэатрах, паслалі паркетную падлогу і ўстанавілі камін. Каралеўскую ж упрыгожваў картуш з гербам караля. Для асвятлення памяшкання выкарыстоўваліся некалькі раскошных крыштальных люстраў, а таксама мноства свяцільнікаў, размешчаных ля сцен. На саміх жа сценах знаходзіліся спецыяльныя свяцільнікі з падстаўкамі.

Для таго, каб можна было ставіць спектаклі, найлепш набліжаныя да самога жыцця, былі ўзяты на ўзбраенне найноўшыя для таго часу тэхнічныя сродкі, якія дазвалялі лёгка мяняць дэкарацыі, а пры `неабходнасці "выводзіць" на сцэну нават сапраўдныя караблі. Дзеля гэтага яна была падзелена папалам. Пярэдняя частка, як і традыцыйна ў тэатрах, выкарыстоўвалася па сваім непасрэдным прызначэнні, на ёй іграли акцёры.

Задняя ж пры неабходнасці лёгка запаўнялася вадой. Ажыццяўлялася гэта праз сістэму труб, што праходзілі да самых тэатральных падмосткаў. Паступала ж вада з сажалкі, што знаходзілася непадалёку ад будынка. Гэтая частка сцэны аказвала добрую паслугу і тады, калі па ходзе спектакля разгортваліся баявыя дзеянні, ці неабходна было паказаць войскі на маршы. У гэтым выпадку ваду спускалі, а зверху клалі тоўстыя шчыты. З тыльнага ж боку сцэны адкрывалася вялізная брама, праз якую магла ўварвацца кавалерыя ці прайсці пяхота.

У Слоніме працавалі таленавітыя акцёры, танцоўшчыкі, музыканты, а іх патрабавалася нямала, бо ставіліся оперныя і балетныя спектаклі з немалым прыцягненнем дзейных асоб. Шматлікім па колькасці выканаўцаў быў і слонімскі аркестр. Некаторыя даследчыкі называюць яго лічбу ў 53 чалавекі, а гэта толькі спецыялісты вакальнай і інструментальнай музыкі. Дырыжорамі з'яўляліся канцэртмайстар Юзаф Паўлі і капельмайстар Аляксандра Данесі, які ў тэатры Агінскага сфарміраваўся як выдатны знаўца сваёй справы.

Італьянцамі па паходжанні былі і некаторыя спевакі, а сярод дырыжораў, інструменталістаў сустракаліся і немцы, чэхі, а гэта гаворыць аб тым, што Міхал Казімір ахвотна шукаў лепшых спецыялістаў за мяжой. Часам запрашаў да сябе і прафесійных музыкантаў з Ружан ці Нясвіжа. Аднак многія акцёры, танцоўшчыкі музыканты рыхтаваліся з таленавітых юнакоў і дзяўчат, якіх гетман шукаў у навакольных вёсках, а таксама ў іншых сваіх уладаннях, а затым пасылаў на вучобу.

Менавіта ў гэты, слонімскі, перыяд у жыцці Міхала Казіміра і з'явілася мянушка "гетман-кларнет", на якую ён не крыўдзіўся. Ды і як было крыўдзіцца, калі амаль штодзённа ці то іграў сольную скрыпку ў сваім аркестры, ці то выконваў партыю ў яго суправаджэнні. Былі гледачы ў захапленні і тады, калі на сцэне ажывалі вобразы ў спектаклях, да якіх Агінскі меў дачыненне як аўтар музыкі.

Сёння цяжка дакладна сказаць, якія канкрэтна творы былі напісаны самім Міхалам Казімірам, а якія народжаны фантазіяй ягонага пляменніка, аўтара знакамітага паланеза "Развітанне з Радзімай" Міхала Клеафаса Агінскага. Няма пэўнасці і наконт опернай музыкі Міхала Казіміра. Многія сыходзяцца толькі ў тым, што ён аўтар лібрэта і музыкі да оперы "Елісейскія палі", якая была пастаўлена ў Слоніме ў 1788 годзе і адразу ж увайшла ў другі том "Баек і не баек" Міхала Казіміра. Не адмаўляецца і яго аўтарства музыкі да оперы "Цыгане" (лібрэта Ф. Князніна). Не выклікае сумнення, што Міхал Казімір напісаў і оперу "Зменены філосаф".

Дакладна немагчыма сказаць, і якія кнігі выдаў. Калі наконт ягонага аўтарства "Баек і не баек" сумненняў няма, а тым больш наконт "Гістарычных і маральных аповесцяў, напісаных грамадзянінам са Слоніма", дык нельга адназначна паставіцца да "Кніжкі ў вялікую актаву", а тым больш да некалькіх паэтычных твораў. Яны хутчэй прыпісваюцца Міхалу Казіміру, як і пераклады п'ес Кацярыны II "Ашуканец" і "Імяніны пані Варчалкінай".

У Слоніме апроч тэатра стварыў таксама некалькі прадпрыемстваў, заснаваў друкарню. Памяць аб сабе Міхал Казімір пакінуў і дзякуючы штучнай воднай артэрыі, збудаванай ім на Палессі, якая носіць назву канал. Агінскага, Вялікі Пінскі канал, Порт Агінскага. Правільней насіла, бо сёння гэтая частка воднага шляху з Дняпра ў Нёман, якая злучае прыток Прыпяці Ясельду і Шчару (прыток Немана) і складае з Выгданаўскім возерам 54 кіламетры, несуднаходны. У Слоніме наладзіў габеленавую і дывановую вытворчасць, пабудаваў фаянсавую фабрыку ў Целеханах.

Калі ўзнікла Таргавіцкая канфедэрацыя — саюз магнатаў Рэчы Паспалітай, якія пераканаліся ў бесперспектыўнасці далейшага супрацьстаяння з Расіяй, да яе не далучыўся, але 6 ліпеня 1793 года склаў з сябе гетманскія паўнамоцтвы на карысць пляменніка. Ды Міхал Клеафас вялікім гетманам так і не стаў, бо ўмяшаўся расійскі генерал Я. Сіверс.

Наблізілася старасць, а з ёй прыйшлі хваробы. Калі што і радавала яго яшчэ, дык ранейшае захапленне музыкай. Яна стала для Міхала Казіміра духоўнай аддушынай і ў час паўстання пад кіраўніцтвам Тадэвуша Касцюшкі. А яшчэ ўсцешвала сяброўства з Гайднам, які з разуменнем паставіўся да ягонага таленту, падказваў тэмы новых твораў.

Калі адбыўся Трэці падзел Польшчы, Агінскі, як ні цяжка было яму адважыцца на падобны ўчынак, нарэшце прысягнуў на вернасць Кацярыне II, ды гэта мала што змяніла ў ягоным жыцці. Імператрыца ўсё адно канфіскавала Слонім, выраішыўшы размясціць там губернскія ўлады, і адмяняць сваё рашэнне не збіралася. Гэта ажыццявіў толькі Павел I. Была вернута Агінскаму і частка даходаў ад Пінскай эканоміі. Нарэшце, удалося атрымаць назад маёнткі, у свой час прададзеныя Міхалу Клеафасу.

Фінансавае становішча палепшылася, аднак гэта прынесла мала радасці, бо ўжо даўно не быў тым маладым і прыгожым мужчынам, які любіў жанчын, амурныя прыгоды. А на ўсё патрабаваліся грошы. Шмат грошай. І ён іх ніколі не шкадаваў. На жанчын і на музыку, на мастацтва. Музыка па-ранейшаму заставалася тым адзіным, што хоць крыху прыхарошвала аднастайнае жыццё некалі бравага "гетмана-кларнета", які бавіў свае апошнія дні (памёр Міхал Казімір 31 мая 1800 года) у маёнтку Галенаў і толькі зрэдку наведваўся ў Варшаву, пасяляўся ў ёй на вуліцы Рымарскай у палацы, які атрымаў у спадчыну ад сваёй цёткі Ганны Агінскай. Каб паехаць куды-небудзь далей, неставала сіл, таму больш так і не наведаўся ў Слонім.

Міхась ЯНОВІЧ.

Пра Міхала Казіміра Агінскага можна прачытаць:

Цеханавецкі А. Міхал Казімір Агінскі і яго "сядзіба музаў" у Слоніме. Мн.., 1993.

ВПЕЧАТЛЕНИЯ

Там, в Германии...

Для многих немцев что Беларусь, что Россия — одно и то же. Отправляю, например, домой посылку. Работница почты уточняет: "Беларусь — это Россия?" "Нет, — объясняю, — это два совершенно разных государства...".

Другие мои немецкие знакомые при встрече спрашивают: "Ну, как там ваш Путин?" Надоело объяснять, что Путин не у нас.

Наш человек привык в незнакомом городе обращаться за справкой к милиционеру. Зашел я однажды в привокзальный полицейский участок в Дюссельдорфе. Дежурный офицер поинтересовался: "Откуда приехал?" "Из Беларуси?" Ответ явно ни о чем ему не говорил. Пробую использовать вторую версию — "Вайсрусланд". И опять удивление: "Русских знаю, а белых русских — нет! Где это?" Его коллега оказался более сведущ в географии: "Это около Польши".

Вообще, на вопрос "Знают ли о нас в Германии?" можно ответить: "Как где". Допустим, в городке Бетсдорф (Земля Рейн-Пфальц) о Беларуси знают все жители, так как уже лет десять сюда регулярно приезжают наши дети на оздоровление. И таких городков в Германии немало.

Но почему-то знания немцев о Беларуси какие-то однобокие. Часто, узнав откуда ты прибыл, собеседники сочувственно произносят: "Ах да, Лукашенко, Чернобыль..." Приходится объяснять, что Лукашенко не виноват в том, что произошло в Чернобыле. Еще до него "намудрили" наши атомщики и горе-политики.

На улицах Бонна.

Фото Александра СИЛИЧА.

Голый канцлер

Во время последнего карнавального шествия в Дюссельдорфе противники нынешнего канцлера провезли через весь город трехметровую фигуру голого Шрёдера со всеми причитающимися мужскими атрибутами!

Полиция никого не арестовала за "оскорбление чести и достоинства канцлера", никого не разгоняла, никого не лупила дубинками и не травила газом. Было весело, смешно, радостно, одним словом — цивилизованно и демократично.

Я представил себя на минуту подобный акт у нас в центре Минска. Не приведи Господь! Как говорится, даже подумать страшно! Это вам не "пушкинская" тачка с навозом на газоне в районе президентской резиденции. За такое не только почки отобьют, за такое у нас и под асфальт закатать могут.

Кстати, здесь один мой знакомый полицейский страшно удивился, когда узнал, что у нас можно идти работать в милицию всего лишь отслужив в армии, то есть без специального образования. Для них это немыслимо, как немыслимы взятки, которые иногда пытаются по совковой привычке всучить им наши проштрафившиеся автомобилисты. Чтобы попасть на работу в полицию, в Германии надо несколько лет проучиться в специальном учебном заведении. Среди немецких полицейских заметен демократизм в отношении внешнего вида: много бородатых, попадаются бритоголовые или с серьгой в ухе...

По моим наблюдениям, немецкая полиция строга и в то же время слишком либеральна. Однажды ночью кто-то из жильцов многоэтажки позвонил в участок и попросил разогнать группу мотоциклистов, тарахтевших во дворе дома. Один из нарушителей чуть ли не хватал полицейского за грудки, доказывая свои права. Наши хлопцы сразу бы начали лупить палками и сажать в "воронок", а эти долго и терпеливо упрашивали хулиганов разъехаться по домам.

Другой раз мне пришлось быть свидетелем разгона драки между албанской молодежью и "русаками". Один парень из группы албанцев минут десять выкрикивал в сторону полицейских отборные немецкие ругательства и показывал оскорбительные жесты. Наконец, кто-то из стражей порядка не выдержал, вывел его из толпы и пристегнул наручниками к футбольным воротам. Но и после этого поток ругательств не прекратился.

Знакомый "русак" рассказывал, как однажды ночью он в сильном подпитии возвращался из соседней деревни. Когда рядом остановилась полицейская машина, он здорово перетрухнул и долго отнекивался, не хотел в нее залазить. Доблестные полицейские довезли его до самого порога и отдали прямо в руки жене.

Ох уж эти четвероногие друзья!

Стоит только на минутку поставить машину в неположенном месте, как вмиг, словно из-под земли, появляются политесы со штрафом (не путать с полицистками). А то и отбуксируют еще за трехзначную сумму. Повсюду в городах они маячат со своими маленькими карманными компьютерами, чтобы поймать очередную жертву. Наверно, их зарплата напрямую зависит от количества оштрафованных.

Но скажу: лучше бы они такое же рвение проявляли в ловле невоспитанных владельцев собак. Есть законы, существуют штрафы, но они не действуют. Даже как-то неудобно: немцы всегда кичились своей чистотой и чистоплотностью, а тут — вся страна чуть ли не по колено в собачьем дерьме! Центральные улицы — более-менее в порядке, а свернешь в сторону — будь внимателен! Иди, как по минному полю, иначе "подорвешься" на очередной кучке...

Конечно же, я утрирую, преувеличиваю. Чисто в Германии. Просто сегодня я не в духе: поутру сам наступил на такую вот "мину". Да и не очень-то большая она была, может быть, от какой-нибудь злющей таксы, но заскользил я на ней, как по льду. Чуть не растянулся на асфальте!

Многие наши земляки, работающие на стрижке газонов, питают лютую ненависть к собакам. К концу рабочего дня они с ног до головы заляпаны этим... добром, пулей вылетающим из-под газонокосилки.

То, что немцы, как и англичане, любят животных, наверное, вам известно. Можно увидеть на улице какую-нибудь дворнягу в ошейнике за 25 евро и на таком же "дешевом" поводке. Конечно, преобладают здесь хорошие, породистые собаки. Единственное, чего тут не увидишь, так это бездомных кошек и собак.

Если вы живете в многоэтажке, то завести кошку или собаку — дело довольно хлопотное. Нужно спросить согласия у соседей и хозяина дома.

У моих знакомых кошка похожа на гиену — черно-белорыжая. Страшилище, одним словом, из тех, что шныряют по минским помойкам. Но у немцев такая трехцветная кошка в особом почете — считается, что она приносит в дом удачу.

Эхо войны

Один из ведущих специалистов по истории Второй мировой войны Гидо Кнопп делает хорошие документальные фильмы, пишет книги, "раскапывает" малоизвестные факты времен третьего рейха.

Польский офицер, решивший после боя погреться у костра во дворе какой-то канцелярии, обнаруживает секретные документы СС — не успели сжечь. Когда специалисты их изучили, они были в шоке. Оказалось, что в СС существовал специальный отдел, занимавшийся... ведьмами! Да, да, велся поиск этих самых ведьм, существовала специальная картотека... Вопрос разрабатывался на самом высоком научном уровне. Когда узнаешь подобные факты, все больше понимаешь: какой винегрет, какая средневеково-мистическая мешанина была в головах заправил нацистского режима! Не удивительно, что эти головы рождали чудовищные, антигуманные идеи. Но были в их действиях и логически оправданные поступки, хотя от этого их преступный результат не преуменьшается.

Гимлер был помешан на идее увеличения арийской расы. Проводились чудовищные эксперименты в концлагерях, всячески поощряли "чистопородных" немецких женщин-рожениц... Но огромные потери на фронтах заставляли искать другие, кардинальные решения. И вот в 1941 году появляется приказ: из Польши, Беларуси, Украины, вывозить детей-блондинов с голубыми глазами. Особое внимание обращалось на детдома, сиротские приюты и т.п. В Германии детям давали немецкие имена. Они усыновлялись (удочерялись) бездетными семьями или теми, кто потерял детей на фронтах... Счет идет, наверное, на сотни тысяч. Например, из района только одного польского города Замостье отправили в Германию 30 тысяч детей.

По сей день живут в Германии эти дети, они уже пенсионеры, ухоженные и холеные бабушки и дедушки: наверное, гордые своей "арийской" чистотой... Ездят, путешествуют по миру, возможно, и в Беларуси побывали, не подозревая, что это их истинная Родина.

Иван ХОХОЛ.

Аўстрыйская «кобра» выратавала 60 беларускіх дзяўчат

Аўстрыя зноў апынулася ў цэнтры скандалу, звязанага з гандлем людзьмі. Раней у гучнай справе быў замешаны колішні чэмпіён свету па фігурным катанні Ёзэф Шварц. Пад выглядам набору танцорак для аўстрыйскіх вар'етэ (а насамрэч для працы ў бардэлях) у розных усходнееўрапейскіх краінах, у тым ліку і ў Беларусі, шукаліся прыгожыя маладыя жанчыны. Днямі адказныя прадстаўнікі аўстрыйскіх крымінальных ведамстваў агучылі чарговую скандальную справу. Прадстаўнікі Беларусі фігуруюць у ёй і як ахвяры (гэта 150 беларускіх дзяўчат), і як абвінавачаныя.

У шэрагу ўплывовых выданняў кшталту "Kurier" паведамленні, звязаныя з гандлем людзьмі, надрукаваныя са спасылкай на кіраўніка федэральнай службы бяспекі краіны Алоіса Лісля. Але ў самім ведамстве гэтую справу каменціраваць адмовіліся. Толькі паведамілі, што ў інтарэсах следства ўся інфармацыя падаецца толькі ў часе адмысловых прэс-канферэнцый. Што да самай апошняй прэс-канферэнцыі з удзелам Алоіса Лісля, то, паводле інфармацыі шэрагу выданняў, кіраўнік службы бяспекі зазначыў наступнае: гандаль беларускімі жанчынамі ў Аўстрыі прадуманы да дробязяў.

Пасрэднікі з Беларусі адшуквалі найбольш прывабных і камунікабельных дзяўчат, якія валодаюць нямецкай мовай, ва ўзросце ад 21 да 25 год і абяцалі ім вельмі папулярную сярод моладзі працу Au-Pair альбо прыбіральшчыц, нянек у Заходняй Еўропе. Тое, што ў выніку прыйдзецца займацца прастытуцыяй, не здагадваўся ніхто. Дзяўчаты спакойна аформлялі візы ў нямецкай амбасадзе ў Мінску. Шлях у Аўстрыю пралягаў праз Берлін.

У аэрапорце ў Вене беларусак сустракалі іншыя пасрэднікі і ўжо адтуль дастаўлялі дзяўчат у дарагі бардэль у Гросраўме, непадалёк ад Лінца.

Як паведаміў журналістам Алоіс Лісль, у аўстрыйскіх следчых ужо раней былі падазрэнні адносна дзейнасці аднаго пасрэдніцкага бюро. Сёння, дзякуючы супрацоўніцтву аўстрыйскіх следчых з калегамі з беларускага крымінальнага вышуку, сталі вядомымі і іншыя дэталі справы.

Уладальнікамі бардэля ў Гросраўме ля Лінца з'яўлялася аўстрыйская сямейная пара, якая мела цесныя дачыненні з пэўнымі крымінальнымі коламі ў Беларусі. Паводле слоў Алоіса Лісля, дзяўчаты знаходзіліся пад пастаянным псіхічным ціскам. Кожная з іх мела мабільны тэлефон і мусіла адказваць на пастаянныя званкі кліентаў альбо гэтак званай назіральніцы, таксама беларускі, якая мела мянушку Пітбуль.

Жанчына пастаянна пільнавала дзяўчат, а таксама сачыла за тымі грашыма, якія яны зарабілялі. Звычайна большую частку грошай забіралі арганізатары бізнесу. Акрамя таго, з дзяўчат спаганялі ў некалькі разоў больш высокую плату за кватэру. Існавала таксама сістэма жорсткіх штрафных грашовых санкцый.

Днямі пасля паспяхова праведзенай суместнай аперацыі з удзелам супрацоўнікаў аўстрыйскай арганізацыі па барацьбе з тэрарызмам "Кобра", следчых федэральнага крымінальнага ведамства ў Вене, удалося вызваліць 60 беларускіх дзяўчат, а таксама арыштаваць уладальнікаў бардэля і назіральніцу Пітбуль.

Яе суайчынніца, якая таксама мае дачыненне да гэтага крымінальнага бізнесу, паводле інфармацыі аўстрыйскага следства, хаваецца ў Нямеччыне. Як заявіў Алоіс Лісль, аперацыя працягваецца. Не выключана, што ў блізкім часе адбудуцца новыя арышты.

www.svaboda.org

ЛЮБОПЫТНО

Буйство цветов и фантазии в Челси

В выставке цветов участвуют 600 дизайнеров. На территории парка в Челси были разбиты десятки садов.

Эти розы *(на фото)* названы в честь городской полиции Лондона. Их отличают особенно длинные и колючие шипы, отпугивающие воришек от оград домов.

Цветы везде, везде, везде...

Водитель осла оштрафован за пьяную езду

Суд оштрафовал южноафриканца на 2100 рандов (около 600 долларов США) за управление ослом в пьяном виде.

Инцидент случился в городе Филиполис в 650 километрах к югу от Йоханнесбурга. Полицейские остановили Ханса дю Туа, заметив, что его запряженная ослом повозка двигалась по улице, мягко говоря, неровно. Вообще-то подобные случаи в этой местности нередки. "Обычно дело ограничивается внушением. Пьяному приказывают распрячь животное и продолжать путь пешком", — сказал корреспонденту Би-Би-Си судейский чиновник.

Дю Туа, однако, проигнорировал распоряжение и поехал дальше, как только полицейские отошли в сторону. Такого непочтения стражи порядка не стерпели. На следующем посту дю Туа заставили спешиться, вызвали его жену, а затем передали дело в суд.

О КОМ ГОВОРЯТ

Александр КУЛЛИНКОВИЧ:

«Глуп тот, кто считает большой проблемой отсутствие квартиры, жены...»

«Молодость — золотое время в жизни каждого человека. Вот только легко ли быть молодым?

Об этом журналисты "Народной воли" разговаривают с лидером популярной белорусской рок-группы "Нейро Дюбель" **Александром Куллинковичем.**

— Знаете, мне сложно рассуждать об этом, потому что меня в молодости не "душили". Мне в жизни повезло с родителями, друзьями. Я ни в чем не знал ограничений. Очень рано стал жить один, рано стал водить девочек, рано поставил замок в свою комнату... Иногда я даже говорю своей маме: "Зачем ты мне в 15 лет столько разрешала?" Сейчас я понимаю, что тогда мне не хватало несвободы.

— Счастье молодого человека как раз и заключается в свободе выбора. Саша, ты за то, чтобы ее ограничивать?

— Подросток — как слепой человек, которому сначала надо попробовать, чтобы понять, что предмет бьется током. А для взрослого достаточно увидеть надпись — 220 вольт.

У Кропоткина, которого я очень люблю, есть такое определение: несвободный человек — тот, который отказывает себе в удовольствии из-за боязни наказания, а свободный — тот, который отказывает себе в удовольствии по моральным причинам. Я за то, что в жизни надо уметь все. Но далеко не все из того, что умеешь, надо делать.

— Получается, что идеальный молодой человек — тот, кто делает далеко не все, что умеет?

— Как человек может быть идеальным? Живое существо не может быть идеальным по определению. Что такое идеальный видеомагнитофон, я приблизительно представляю — это предмет, и у него есть соответствующие характеристики. Идеальный человек — это что-то мифическое.

— Значит, идеальный человек — это миф. А кто в твоем понимании является молодым?

— Молодой человек для меня — это тот, у кого нет семьи и детей. Для такого — всё побоку. Он может даже не работать нигде, а все свое свободное время проводить на рыбалке...

— И при этом материально зависеть от родителей...

— Необязательно, можно взять палатку и жить в лесу. Молодые все равно меньше зависимы от чего бы то ни было. Я, допустим, очень зависим от того, что происходит в обществе и в стране. Я не считаю себя молодым, потому что у меня есть семья, дом, ребенок, мне нужно платить за электричество, газ... А молодой человек — свободен, перед ним много путей открыто. Глуп тот, кто считает большой проблемой отсутствие квартиры, жены... Если у тебя есть семья и дом, то у государства появляется больше рычагов давления, что ограничивает свободу. Поэтому я ненавижу государство, но при этом люблю свою страну.

— Поклонники "Нейро Дюбеля" — в основном молодые люди. Саша, пытаешься ли ты через творчество донести свое видение ситуации в государстве, которое, по твоим же словам, давит на гражданина?

— Нет. "Нейро Дюбель" полностью аполитичен. Я вообще не понимаю, как можно петь о политике, сочинять песни протеста... У нас все песни исключительно про любовь: к Родине, женщине, пиву. Музыканты могут повлиять на ситуацию, выразив свою гражданскую позицию.

В свое время БПСМ предлагал выступить на концерте под их знаменами. Мы отказались, потому что если в это, простите, дерьмо один раз вступить, то потом отмыться будет проблематично. Все просто, как грабли. Допустим, мы согласились поучаствовать в этом концерте. Естественно, на афише будет написано, что БПСМ представляет группу "Нейро Дюбель". Естественно, билеты будут дешевыми, на концерт придут подростки 14—16 лет. А завтра этим же подросткам предложат вступить в эту сомнительную организацию. Они вспомнят, что вчера были на концерте, который организовывал БПСМ и на котором выступала их любимая группа... и вступят. Проявление гражданской позиции музыканта заключается также и в том, где выступать, а где нет. Я, кстати, очень подозрительно отношусь к производным слова *патриотизм* в названии организации...

— Саша, с твоей гражданской позицией ясно все: накануне президентских выборов 2001 года "Нейро Дюбель" ездил в гастрольный тур не от имени Лукашенко. Какое впечатление оставила сельская молодежь?

— По сравнению с белорусской глубинкой Минск — это просто Лас-Вегас. Здесь все благополучно и демократично, а в глубинке — народ даже пикнуть боится. Молодежь там в основном безразлично относится к тому, что происходит. В том туре к нам подходили восемнадцатилетние люди с вопросом "А за кого голосовать?". Сельская молодежь спивается, ее ничего не интересует — это пугает.

— Водка думать отучает...

— Да если б молодежь пила водку, то не все было бы так плохо!

— В смысле?

— Бутылка водки стоит чуть больше двух долларов. Для того чтобы каждый день употреблять "огненную воду", молодому человеку надо работать. А в деревнях пьют самогон и "чернило". Короче то, что дешевле.

— Ну, конечно, дешевле купить "пойла", чем семью содержать. Кстати, как ты относишься к тем парам, которые оформляют отношения в 18—20 лет?

— Ситуации в жизни разные бывают. Хотя, на мой взгляд, ранний брак — это ошибка. Отношения оформлять — это еще ладно, но детей заводить... Молодые люди должны думать о рождении ребенка, твердо встав на ноги. Тогда эти люди становятся частью общества. А общество, на мой взгляд, состоит из тех, кто оплачивает коммунальные платежи. Молодежь существует отдельно от общества, она менее зависима от процессов, происходящих в нем.

— Так в чем вопрос, если молодым так легко жить?

— Нынешнему подростку не так легко быть молодым из-за того, что вокруг очень много соблазнов. В наше время были только мелкие "уголовные" радости — даже за "Плэйбоем" приходилось идти по нескольку километров в лютый мороз, а сейчас такие темы открыты...

Дарья ГАВРИЛОВА,
Виталий ГАРБУЗОВ.
Фото Сергея ЧЕРВЯКОВА.

«Пошук» шукае нямецкіх ветэранаў

Дзіцяча-юнацкі эколага-турыстычны інфармацыйны клуб "Пошук" пры падтрымцы Мінскага гарадскога турысцка-экалагічнага цэнтра рыхтуе беларуска-нямецкую краязнаўчую экспедыцыю па Мінскай вобласці. Яна прысвечана 60-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне і пройдзе па месцах размяшчэння ваенных мемарыялаў і помнікаў прыроды.

Як паведаміў БелаПАН кіраўнік "Пошуку" Аляксей Мухля, членамі клуба, створанага ў 1997 годзе пры дзіцячай бібліятэцы № 2 Мінска, з'яўляюцца некалькі дзесяткаў падлеткаў і маладых людзей ва ўзросце ад 13 да 19 гадоў. Клуб арганізуе экалагічныя паходы, а таксама экспедыцыі па месцах дзейнасці партызанскіх брыгад з мэтай збору інфармацыі аб нямецкіх салдатах, якія ваявалі на баку партызан.

Прадугледжваецца, што ў экспедыцыі возьмуць удзел як прадстаўнікі "Пошуку", так і сваякі нямецкіх салдат-антыфашыстаў, якія ваявалі на тэрыторыі Мінскай вобласці ў складзе партызанскіх атрадаў.

Цяпер арганізатары экспедыцыі шукаюць нямецкіх ветэранаў або іх сваякоў, разлічваючы пры гэтым на падтрымку Пасольства Германіі ў Беларусі. Сёлета плануецца завяршыць усю падрыхтоўчую работу, а ў маі будучага года — адправіцца ў экспедыцыю.

Лавінія АРЭШКА.

Крычаўскі клуб «Каму за трыццаць» закрылі за парушэнне дырэктывы прэзідэнта № 1

Клуб "Каму за трыццаць", які быў створаны на базе Крычаўскага клуба чыгуначнікаў, спыніў сваю дзейнасць за парушэнне вядомай дырэктывы прэзідэнта № 1. Падчас вячэрняга рэйду супрацоўнікі міліцыі выявілі, што ў памяшканні клуба многія яго члены знаходзяцца ў стане алкагольнага ап'янення.

Як паведаміў БелаПАН кіраўнік Крычаўскага грамадскага аб'яднання "Кантакт-цэнтр" Лявон Свецік, клуб "Каму за трыццаць" быў створаны два месяцы таму для правядзення вольнага часу мужчын і жанчын, якія не былі ў шлюбе. Наведаўшы адну з такіх сустрэч, міліцыянеры ўбачылі, што знаёмства і сумесны вольны час членаў клуба суправаджаецца ўжываннем спіртнога, што парушае дырэктыву. У выніку на многіх прысутных былі складзены пратаколы за парушэнне дысцыпліны, а сам клуб — закрыты.

Андрэй АЛЕКСАНДРОВІЧ.

ШАШКІ

Перакрыццё «кісларода»

Працягваем класіфікацыйны конкурс-12. Кандыдат у майстры спорту Дзмітрый Камчыцкі (Магілёў) прапануе чарговыя заданні:

9.Белыя: дамкі a3, e1, простыя d4, f2 (4).

Чорныя: дамка f4, простыя a7, f6, h2 (4).

У галоўным варыянце белыя перакрываюць "кісларод" чорным a7 і f4 і неяк элегантна.

10.Белыя: дамкі a3, f8, простая a7 (3).

Чорныя: b4, c5, e3, e5, h4 (5).

11.Белыя: дамкі b8, d2, простыя c3, c7 (4).

Чорныя: a5, b6, g3, g7, h2, h6 (6).

Ва ўсіх заданнях белыя пачынаюць і перамагаюць. Кожнае з іх ацэньваецца ў тры ачкі.

Тэрмін для адказаў — традыцыйных два тыдні. Чакаем іх па адрасе: **220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а, рэдакцыя газеты "Народная воля", "Шашкі".**

Супаставім рашэнні

Праверце, калі ласка, рашэнні пазіцый, змешчаных 1 красавіка.

"Новыя заданні". Класіфікацыйны конкурс-14 (М.Грушэўскі): **№5** — d4 (e1 A) f2 (a5) b4, b8x. A (a5) b4, f2, b8x. Варыяцыя праблемы аўтара ("Настаўніцкая газета", 24.08.1966 г.); **№6** — g3 (f4 A) gf2, d6, c5, c7, e3, c7x. A (c5, b4, f4) gf2 і г.д.; **№7** — g3, c7, e7, f2 (fg3) i e1! (g7) c3 (f2) e3 (g3) h8 (h2) hd4 (g1) a7x. I d4? (f2!) e3 (g3)=.

Рашылі: Д.Камчыцкі, Л.Колас, В.Кавалёва, В.Масквіч, М.Блізнец, М.Андрушчанкаў, В.Кардаш, А.Чумакоў, Ю.Сегень, І.Мацкевіч, А.Пярхальскі, А.Сняжкоў, А.Ліцьвінаў, А.Ашыхмін, І.Шчадко, А.Кагоцька, У.Сапяжынскі, В.Грабенка, А.Ляхоўскі, М.Клезовіч, Я.Кандрачэнка, Л.Вітошкін, В.Казарэвіч, В.Астрынскі, М.Буканаў, С.Супрунюк, В.Краўчук, А.Янчук, М.Гардзіеўскі, В.Таратушкін, П.Чэрнак, У.Мазанік, Л.Жыхар, Ф.Хадачынскі, В.Дзялендзік, Г.Логвінаў, А.Панкраценка, В.Касцян, А.Белы, М.Падбярэзскі, Аляксандра Камінская, П.Каролік.

А.Грыпічу, А.Жабрыкаву і А.Ляхоўскаму залічаны першыя тры заданні класіфікацыйнага конкурсу-14, а апошняму — №6 і класіфікацыйнага конкурсу-12.



Юбіляры

Вядомым маэстра шашак споўнілася: Андрэю Валюку — 30 год, Уладзіміру Беляеўскаму, Аляксандру Ляхоўскаму і Уладзіміру Масейчуку — 55, Якаву Кухарчуку — 60, Уладзіміру Хоцімку — 65.

А.Валюк з Гродна — чэмпіён СНД 1992 года, свету — 1998 года, сяміразовы чэмпіён Беларусі, міжнародны гросмайстар.

Кандыдат фізіка-матэматычных навук мінчанін У.Беляеўскі заваяваў залатыя медалі ў трох першынствах краіны па шашках-64.

А.Ляхоўскі з Жодзіна — адзіны ў рэспубліцы майстар спорту як па гульні ў шашкі, так і шашачнай кампазіцыі. Вядзе рубрыку "Шашкі" ў рэспубліканскіх газетах "Рэспубліка" і "Белорусская нива". Кіруе абласной федэрацыяй шашак.

У.Масейчук гуляў у фінальнай частцы чэмпіянату СССР 1993 года, з 1976 года ўзначальвае Брэсцкую федэрацыю шашак. А Я.Кухарчук неаднойчы выбіраўся старшынёй сталічнай федэрацыі шашак.

Майстар ФМЖД У.Хоцімка з Косава Івацэвіцкага р-на мае тытул чэмпіёна рэспублікі па перапісцы, а ў складзе Беларусі — і чэмпіёна каманднага першынства СССР.

Віншуем знакамітых шашыстаў з іх юбілейнымі датамі і зычым поспехаў — і не толькі на шашачнай ніве!

Трошкі гісторыі

Душэўны спакой Юлія Кануса, які пры жорсткім імператары Калігуле (12—41 гады) быў прысуджаны да пакарання смерцю, здзівіў рымскага філосафа Сенеку. Таму Сенека ў сваім сачыненні аб Канусе прывёў і такі выпадак: "Ён гуляў у шашкі, калі сотнік загадаў паспяшыць. Канус пералічыў шашкі і звярнуўся да свайго праціўніка: "Глядзі, пасля маёй смерці не схлусі, што ты перамог". Затым кіўнуў галавой і сказаў сотніку: "Будзеш сведкам — у мяне на адну шашку больш. Ці мяркуеш ты, што Канус выйграў і ў гэтай партыі?".

Прападобны Нікан на пачатку свайго жыцця быў воінам, але затым прыняў хрышчэнне, быў узведзены ў сан епіскапа і атрымаў духоўную апеку над сваімі вучнямі.

Епіскап Нікан і яго вучні пацярпелі ў час ганенняў на хрысціян пры рымскім імператары Дэкіі ў 251 годзе. Спачатку іх жудасна катавалі, а потым пазбавілі галоў. Святы Нікан лічыцца ахоўнікам гульні ў шашкі.

З нізкі кампазіцый

Ужо 31 чытач выступіў у гэтым раздзеле. Сёння пазнаёмцеся яшчэ з некалькімі іх творамі:

1. (Барыс Іваноў, Мінск). **Белыя:** a3, a5, c1, g5 (4).
Чорныя: a7, c3, e5, f8 (4).

2. (Пётр Кажаноўскі, Пінскі р-н). **Белыя:** a3, c5, d2 (3).
Чорныя: b4, f2 (2).

3. (Аляксандр Сапегін, Мсціслаўскі р-н). **Белыя:** a7, b4, c5, e1, e7 (5).
Чорныя: a5, b6, c3, d2, f4, h4 (6).

4. (Аляксандр Кагоцька, Пінск). **Белыя:** b4, b6, c7, g1, h2 (5).
Чорныя: a5, b2, c3, d2, e3, f2 (6).

Ва ўсіх кампазіцыях першы ход белых і іх выйгрыш. Усе яны адначасова з'яўляюцца заданнямі бліцконкурсу-32. За правільнае рашэнне кожнага з іх налічваецца па аднаму ачку. На гэта даецца 10 дзён. Пераможцу чакае прыз П.Кажаноўскага з яго аўтографам — кніга Г.Хацкевіча "25 урокаў шашачнай гульні" ("Полымя", 1979 г.).

Мікалай ГРУШЭЎСКІ,
майстар спорту.

ШАХМАТЫ

Из шахматной классики

А.Галицкий

Белые: Kpg1, Фd6, Лe4, Сc6, Кc4, пп. g4, h4 (7).

Черные: Kpf3, Сc2, Kb1, Кe6, п. h5 (5).

Мат в 2 хода.

Предлагаем вниманию любителей шахмат двухходовую задачу выдающегося русского шахматного композитора Александра Галицкого. За время своей творческой деятельности А.Галицкий составил более 1800 задач, многие из которых были отмечены призами на конкурсах. Попробуйте найти ее решение. Свои ответы присылайте по адресу: **220030, Минск, ул.Энгельса, 34а, редакция газеты "Народная воля", "Шахматы".**

Сверьте решение

Композиция В.Метлицкого (опубликована 8.04): **1.Kpf7!**

Двухходовка Д.Бронштейна и В.Чепижного ("Народная воля" за 15.04): **1.Kh2!**

Задача Л.Богатырева (опубликована 22.04): авторское решение 1.Лb5! Угроза 2.Фe4! Ф:e4 3.Лa1x 1...b3 2.Фd5! 1...Kpa7 2.Фd7! 1...Kpb8 2.Фf7! и мат следующим ходом. Увы, в задаче есть и побочное грубое решение: 1.Лa1+ Kpb8 2.Фf8+.

Свои ответы на композиции прислали тт.Долгачев (г.п.Костюковка), Супрун (Мозырский район), Тестов, Блохин (Дрибин), Баранов (Витебск), Посвистелик (Гродно), Миронов (Кобринский район), Литвинов, Буканов, Зверев (Минск).

Шахматная элита

Вот уже более 20 лет рейтинг-лист Международной шахматной федерации бессменно возглавляет экс-чемпион мира Гарри Каспаров. Сохранил свои позиции он и в новом рейтинг-листе с показателем 2817. На вторую позицию вышел экс-чемпион мира ФИДЕ и чемпион мира по быстрым шахматам 2003 года индийский гроссмейстер Вишванатан Ананд — 2774. На третьей ступеньке рейтинг-листа находится действующий чемпион мира Владимир Крамник — 2764 (оба Россия). В число 40 ведущих входят также: 4.победитель соревнований претендентов на матч с чемпионом мира Петер Леко (Венгрия) — 2741, 5.Веселин Топалов (Болгария) — 2737, 6.чемпион России Петр Свидлер — 2733, 7.Александр Морозевич (Россия) — 2732, 8.Майкл Адамс (Англия) — 2731, 9.сильнейшая в мире шахматистка Юдит Полгар (Венгрия) — 2728, 10.чемпион мира ФИДЕ Руслан Пономарев (Украина) — 2722, 11.Александр Грищук (Россия) — 2719, 12.Василий Иванчук (Украина) — 2716, 13.Борис Гельфанд (Израиль) — 2714, 14.Алексей Широв (Испания) — 2713, 15.Найджел Шорт (Англия) — 2712, 16.Евгений Бареев — 2711, 17.Владимир Малахов — 2695 (оба Россия), 18.Ливиу-Дитер Нисипяну (Румыния) — 2692, 19.Иван Соколов (Голландия) — 2690, 20.Алексей Дреев (Россия) — 2689, 21.Владимир Акопян (Армения) — 2689, 22.экс-чемпион мира Анатолий Карпов (Россия) — 2682, 23.Е Цзянчуань (Китай) — 2681, 24.Вадим Милов (Швейцария) — 2680, 25.Жоэль Лотье (Франция) — 2680, 26.Зураб Азмайпарашвили (Грузия) — 2679, 27.Этьен Бакро (Франция) — 2675, 28.Илья Смирин (Израиль) — 2675, 29.Михаил Гуревич (Бельгия) — 2672, 30.Сергей Рублевский (Россия) — 2671, 31.Теймур Раджабов (Азербайджан) — 2670, 32.экс-чемпион мира ФИДЕ Александр Халифман (Россия) — 2668, 33.сильнейший белорусский гроссмейстер Алексей Александров (Минск) — 2668, 34.Александр Белявский (Словения) — 2667, 35.Франциско Вальехо (Испания) — 2666, 36.Виорел Бологан (Молдова) — 2665, 37.Константин Сакаев (Россия) — 2665, 38.Эмиль Сутовский (Израиль) — 2661, 39.Крисан Шашикиран (Индия) — 2659, 47.Шахриар Мамедьяров (Азербайджан) — 2657.

В первую сотню сильнейших гроссмейстеров входит также могилевчанин Алексей Федоров. С рейтингом 2616 он занимает 84-ю строчку рейтинг-листа.

В первой сотне больше всего представителей России — 23. У Англии — 6 представителей, США — 5 (в том числе четверо из бывшего СССР), по 4 у Венгрии, Украины, Израиля, Армении, Китая и Франции. По 3 гроссмейстера входят в первую сотню от Испании, Голландии, Грузии и Германии, по 2 — от Индии, Азербайджана, Молдовы, Дании, Польши и Беларуси. 16 стран делегировали в элитную сотню по одному представителю.

Турнир в Молодечно

Международный шахматный турнир с участием шахматистов из России, Украины и Беларуси прошел в Молодечно. В турнире была установлена норма балла международного мастера. В напряженной борьбе победителем стал мастер спорта Виталий Кочетков (Молодечно). Проведя турнирную дистанцию без поражений, он сумел выполнить нелегкую норму международного мастера — 6 очков из 9 возможных. На пол-очка отстал россиянин международный мастер Олег Куликов, занявший второе место. По 5 очков набрали минчане международный мастер Дмитрий Новицкий и кандидат в мастера Михаил Константинов, разделившие 3—4 места. На пол-очка меньше в активе россиянина Игоря Ахромеева. Сразу 4 участника, в том числе гроссмейтер Генриетта Лагвилава, показали одинаковый результат — 4 очка из 9 и разделили места с 6-го по 9-е.

Приглашение на конкурс!

Газета "Вечерний Петербург" проводит XII международный конкурс составления двух-, трех-, многоходовых задач и этюдов. Композиции (не более одной в разделе) следует посылать до 1 июля 2004 года по адресу: 191000, С.-Петербург, Конногвардейский бульвар, 4, 3-й подъезд, редакция газеты "Вечерний Петербург" с пометкой на конверте "Шахматы для любознательных".

ДАЖЫЛІСЯ...

27 май

ЧАЦВЕР
Усх. 4.50 Зах. 21.25
Даўж. дня 16.35
Першая квадра
ў 10.58

90 гадоў з дня нараджэння А.П. Бялевіча (1914—1978), беларускага паэта

Дзед прадаў ордэн

На невялікай чыгуначнай станцыі я чакаў прыгарадны цягнік. Побач на лаўцы сядзеў жвавы дзядок, нечым нагадваючы Лесавіка з дзіцячай казкі: сівыя калматыя бровы, ружовыя шчочкі і па-маладому сінія вочы. Ён круціў галавой па баках з цікавасцю назіраючы, як у памяшканні сюды-туды снуюць савецкія ордэны, старыя манеты. Людзі і падказалі, што я маю. Добрыя грошы прапанаваў, то я і прадаў. І медалі хацеў прадаць, але ён медалямі не цікавіцца.

Дзядок цяжка ўздыхнуў і прамовіў:

— Не патрэбны мне той ордэн, не патрэбныя і медалі.

— Няхай бы быў на памяць. Дзецям, унукам перадалі б у спадчыну. Цяпер не шкадуеце, што прадалі?

— Глупства кажаце! — раптам зазлаваў дзядок. — Няма ў мяне дзяцей, значыць, няма і ўнукаў.

Бяздзетныя мы з бабай. Удваіх жывём. А наконт шкадавання, то я вам так скажу: раз мяне, жывога чалавека, ніхто не шкадуе і не шануе, то чаму я, седзячы ў бядноце, павінен шкадаваць нейкі там ордэн?

— Бачу, сур'ёзна вы пакрыўдзіліся, — гледзячы на было ў калгасе такой тэхнікі, з якой бы я не мог управіцца. Дык вось за камбайнерства і атрымаў той ордэн. І медалі ВДНГ СССР маю.

— Неяк жа і купец знайшоўся? — задумліва прамовіла я.

— А ў суседнюю вёску прыехаў з бліжняга замежжа хлапец. Пачаў выпытваць, дзе можна купіць савецкія ордэны, старыя манеты. Людзі і падказалі, што я маю. Добрыя грошы прапанаваў, то я і прадаў. І медалі хацеў прадаць, але ён медалямі не цікавіцца.

старога спрацаванага чалавека, сказала са шкадаваннем.

— А то не! Вядома, пакрыўдзіўся! Колькі гадочкаў спіну гнуў на палях, а баба мая на ферме, а што мы маем на старасці гадоў? Ды нічога! Грошы, якія былі на кніжцы, а было, скажу вам па сакрэце, у нас нямала, — усе інфляцыя з'ела. Пенсію атрымліваем незайздросную, бо каэфіцыент малы. Хто пазней ішоў на яе, той больш атрымлівае, а мы, бачыце, не заслужылі. А ўсё ж трэба купіць. Раней хоць карову трымалі, парасят, то зводзілі канцы з канцамі, а цяпер што? Баба мая хворая, рабіць нічога не можа. Я адзін тупаю. Маем пяць курэй ды ката. Вось і ўся гаспадарка.

А як ішоў на пенсію, колькі нерваў змарнаваў! То адной даведкі не хапае, то другой. Пакуль усе паперы сабраў, думаў пенсіі той не прычакаю. Лічы, два месяцы без капейкі сядзеў. Працаваў, працаваў, а як пайшоў на пенсію, то хоць бы хто добрае слова сказаў. Ніхто нават і брывом не павёў. Крыўдна. Я ж яшчэ і на пенсіі колькі працаваў, бо ў вёсцы людзей мала, кожныя рабочыя рукі на вагу золата.

— А іншых вяскоўцаў хіба ўшаноўваюць, як ідуць на пенсію?

— Дзе там! Нікога добрым словам не ўспомняць. А нам жа шмат не трэба: пару кветачак, цёплае слова на развітанне, і душу да канца дзён сагравала б думка, што ты быў патрэбны, цябе цэняць. Эх! — махнуў рукой з горыччу. — Што тут гаварыць...

Дзядок маўчаў, і яго сінія вочы ад крыўды зрабіліся яшчэ сінейшымі.

— А жывём мы цяпер як? — зноў пачаў ён. — Як трэба бульбу садзіць ці капаць, то ногі адходзіш, пакуль дадуць тэхніку. Сілы няма, руху няма, то і садзім апошнія. У іншых бульба ўжо, лічы, зацвітае, а мы яшчэ толькі садзім. Калі ёй расці?

Вось як нас цяпер шкадуюць, як пра нас дбаюць. А вы кажаце, ці не шкадую я ордэн! Уявіце сабе — ні кропелькі. Нават рады, што чалавек надарыўся ды добрыя грошы за яго даў.

Дзядок прыжмурыў вока, паглядзеў на гадзіннік.

— О, хутка мой цягнік. Трэба ісці, а то спазнюся.

Ён падхапіў сваю сумку, кіўнуў мне на развітанне і пакрочыў да выхаду.

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ.

Чытайце нас у Інтэрнеце: http://nv.promedia.by

Четверг, 27 мая

БТ

07.00, 08.00, 09.00, 10.00, 11.00, 12,00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00 Новости.
07.05, 07.35, 08.10, 08.35 "Доброе утро, Беларусь!".
07.30, 08.30, 19.55 "Деловая жизнь".
09.05 "Специальный репортаж".
09.20, 19.15 "Сага о Форсайтах". Сериал.
10.05, 20.00 "Сокровища мертвых". Сериал.
11.10, 17.30 "Богатые и знаменитые". Сериал.
12.15 "Евровидение-2004".
12.40 "Лавка "Рубинчик и...". Фильм-притча.
14.10 "Точка".
15.10 "Самые, самые, самые". Сериал.
16.05 "5х5".
17.15 "Молитвы Божественный свет". Видеофильм.
18.30 "Новая коллекция" Олега Лукашевича".
19.05 "100 шагов к Олимпу".
21.00 "Панорама".
21.30 "Права человека. Взгляд в мир".
21.40 Футбол. Италия—Беларусь.
23.35 "Клип-обойма".

ОНТ

07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00, 18.00, 20.30, 23.20 "Наши новости".
07.05 "Наше утро".
Техническая профилактика до 17.00.
17.00 "Берег мечты". Сериал.
18.10 "Дом". Реалити-шоу.
19.05 "Клон". Сериал.
20.00 "Время".
21.05 "Другая жизнь". Сериал.
22.15 "Улицы разбитых фонарей". Сериал.
23.35 "Фабрика звезд-4".

РОССИЯ

07.45, 21.00 "Команда "01". Огнеборцы". Сериал.
08.50 "Короткое замыкание". Ток-шоу.
09.45, 23.05 "Вести. Дежурная часть".

10.00, 16.00, 19.00 "Вести".
10.30, 19.30 "Местное время. Вести — Москва".
10.50 "Что хочет женщина".
11.50, 19.55 "Гражданин начальник". Сериал.
16.10 "Пирамида". Телеигра.
16.40 "Инструктор". Сериал.
17.35 "Комиссар Рекс". Сериал.
18.30 "Кулагин и партнеры".
19.50 "Спокойной ночи, малыши!".
22.00 "Вести +".
22.20 "Он или она? В чужом теле". Док.фильм.
23.20 "Ватель". Драма.

ЛАД

06.30 EURONEWS.
08.00, 14.00, 20.00 Новости.
08.10 "Площадь искусств".
08.35, 22.05 "Свободная женщина-2". Сериал.
09.35 "Здоровье".
10.05, 18.30 "Между нами, женщинами". Тележурнал.
10.25, 21.15 "Грешная Анхелика". Сериал.
11.10, 12.55 "Обычный необычный день".
11.45, 18.50 "Плач перепелки". Сериал.
13.25 Мультфильмы.
14.10 "Мультиклуб".
15.05 "Команда "SOS". Сериал.
15.30 "Не зевай!".
15.40 "Бум".
16.10 "Помню слева была груша". Док.фильм.
16.30 "Век неблагодарного прогресса". Док.фильм.
17.20 "Летучая мышь". Музыкальный фильм.
20.15 "Колыбельная".
20.30 "Дела семейные".
22.55 Тяжелая атлетика.

НТВ

09.00, 11.00, 16.00, 18.00 "Сегодня".
09.25 "Квартирный вопрос".
10.20 "Страна советов".
14.35 "Принцип домино".
16.30 "Дикий мир: борьба за выживание".
17.35 "Протокол".
18.40, 23.20 "Господа офицеры". Сериал.
19.45 "Бальзаковский возраст, или Все мужики — сво...". Сериал.
21.00 "Страна и мир".
21.35 "К барьеру!" Ток-шоу.
22.45 "Тайны разведки". Немецкая "Танечка".

СТВ+RenTV

06.30, 18.00 "Минщина. Люди, события, факты".
06.45 "Утро столицы".
07.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.45 "24 часа".
07.50, 20.00 "СТВ-спорт".
08.05 "Светская хроника".
08.20, 23.05 "Технология".
08.35 "Проект "Отражение". Док.фильм.
09.10 "Защита от дурака". Триллер.
11.00 "Великая река Амазонка". Док.фильм.
11.30 "Ессе Номо".
11.45, 20.40 "Фильм, фильм, фильм".
12.00 "Час суда".
13.00 "Дикая планета. Все о собаках". Док.фильм.
13.50, 18.30 "Нина". Сериал.
14.50 "Мятежный дух". Сериал.
15.40 "Пауэр Рейнджерс, или Могучие рейнджеры в космосе". Сериал.
16.00 "Веселые баксы".
16.15 "Добро пожаловаться...".
17.00 "Крутой Уокер". Сериал.
18.15 "Театральные истории".
20.15 "Тема дня".
20.25 "Добрый вечер, малыш...".
20.55 "Одиночка". Боевик.
23.15 "Турпоход".
23.25 "Новости мировой шоу-индустрии".
00.10 "Секретные материалы". Сериал.
00.55 "Новости СНГ".

8-Й КАНАЛ

17.30 "Мультпарад" от "Бюргера".
17.45 "Исполнитель приговора". Худ.фильм.
19.15 "Атомик Филмз" и "К-видео" представляют...
19.20 "Доброе слово Василия Киселева".
19.30 "Вечный зов". Сериал.
20.45 "Вечарніца".
21.00 "Региональный репортаж".
21.15 "Тайное свидание". Мелодрама.

ТВ ЦЕНТР

04.45, 06.30 "Настроение".
07.35 Газетный дождь.
07.45 "Женщина в белом". Сериал.
09.10 "Служебный вход".
09.40 "Войди в свой дом".
09.45 Телемагазин.
10.00, 13.00, 21.00 "События. Время московское".
10.15 "Дата".
11.10 "Доходное место".
11.20 "Твой континент".
12.05, 23.00 "Петровка, 38".
12.25 "Деловая Москва".
13.15 "Инспектор Кресс". Сериал.
14.20, 18.40 "Строительный Олимп".
14.30 "21-й кабинет" с Виктором Белицким.
15.00 "Регионы: прямая речь".
15.30 "Песенка года".
16.00 "Уголовная полиция". Сериал.
17.15 "Московские перекрестки" с Олегом Табаковым".
18.00 "Страсти по Саломее". Сериал.
18.50 "Пять минут деловой Москвы".
18.55 "Франк Рива — человек ниоткуда". Сериал.
21.40 "Секретные материалы: расследование ТВЦ".
22.30 "Времечко".
23.20 "25-й час. События. Время московское".
23.45 "Супердиск".
00.00 "По закону". Сериал.
01.00 "Синий троллейбус".

EUROSPORT

09.30, 12.00, 18.30, 21.00, 22.00 Теннис. Открытый чемпионат Франции.
10.30 Спидвей. Гран-при.
11.00, 23.45 Велоспорт. Чемпионат мира на треке в Австралии.
15.30 Велоспорт. Тур Италии.
23.00 Бокс. Международные соревнования.
00.45 Новости "Евроспорта".
01.00 Футбол. Лига чемпионов.

Адрас рэдакцыі:
220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: тэл./факс(017) 206-68-71.
Тэл./факс рэкламнага аддзела: 206-69-04, 206-69-06.
E-mail : nv@promedia.by
http://nv.promedia.by

Індэкс 63222.

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф СЯРЭДЗІЧ

У сувязі з адсутнасцю магчымасці рэдакцыя матэрыялы не рэцэнзуе і не вяртае, права ўступлення ў перапіску пакідае за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №246 ад 10 кастрычніка 1996 г. (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.). Нумар газеты аддрукаваны з дыяпазітываў заказчыка на ААТ «Красная звезда», 220073, г.Мінск, 1-ы Загарадны завулак, 3. Падпісаны ў друк у 15.00. Аб'ём 2 друк. аркушы. Тыраж: 27 510 экз. Заказ № 655.